Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 ЖНІЎНЯ 2013 г. СЕРАДА № 160 (27525) Кошт 1600 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Вяртанне канадскага трэнера ў беларускую зборную, здаецца, чакалі ўсе: кіраўнікі хакейнай федэрацыі, самі спартсмены, заўзятары. А ён, як і належыць прафесіяналу, прыляцеў — і адразу ўзяўся за работу. СТАР 3

ЛІЧБА ДНЯ

9 млн 461,5 тыс. чалавек

складае, паводле аператыўных даных, колькасць насельніцтва краіны на 1 жніўня. У студзені—ліпені 2013-га нарадзілася 66 тыс. 876 дзяцей, што на 2 тыс. 521 дзіця больш, чым за такі ж перыяд 2012 года. Агульны каэфіцыент нараджальнасці за сем месяцаў у цэлым па рэспубліцы склаў 12,2 на 1 тыс. жыхароў (за аналагічны перыяд 2012-га — 11,8 праміле). За студзень—ліпень 2013 года памерла 74 тыс. 891 чалавек, або на 362 чалавекі больш, чым за студзень—ліпень 2012-га. Натуральнае змяншэнне насельніцтва склала 8 тыс. 15 чалавек. Міграцыйны прырост у студзені—ліпені гэтага года ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам мінулага павялічыўся на 36,6% і склаў 5 тыс. 645 чалавек. Дадатнае сальда міграцыі скараціла натуральнае змяншэнне насельніцтва на 70,4% (у студзені—ліпені 2012 года — на 40,6%).

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У БАБРУЙСК, НА ЭКАФОРУМ!

Навуковы супрацоўнік аддзела «Прырода і экалогія» Брэсцкага краязнаўчага музея Віталій Іваноў (на фотаздымку) 9-ы год запар удзельнічаў у Рэспубліканскім экалагічным форуме, фінал якога сёлета прайшоў у Бабруйску. Маладому навукоўцу было важна падзяліцца сваімі поглядамі і на прыкладах рэгіёнаў Брэстчыны распавесці пра назапашаны вопыт у справе захавання навакольнага асяроддзя. Таксама яму цікава было даведацца і пра здабыткі эколагаў з іншых рэгіёнаў Беларусі, у тым ліку і Магілёўшчыны.

— У эколагаў таксама ёсць свае «дажынкі», — кажа Віталій Іваноў. СТАР 5

КАРАТКА

У Беларусі за студзень—ліпень гэтага года зарэгістравана амаль 44,9 тыс. шлюбаў, іх колькасць павялічылася ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 21,5 працэнта. Што датычыцца разводаў, то за такі ж перыяд іх зафіксавана менш як 20,4 тыс., іх стала менш на 17,3 працэнта.

Да 2025 года доля жыхароў Беларусі, якія маюць залішнюю вагу, можа дасягнуць 50 працэнтаў, паведаміла кіраўнік лабараторыі праблем здароўя дзяцей і падлеткаў РНПЦ «Маці і дзіця» Маргарыта Дзевялтоўская.

Эколагі з ЗША звярнуліся да Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі з просьбай прысвойваць ураганам імёны палітыкаў, якія ігнаруюць праблему змянення клімату.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.08.2013 г.

Долар ЗША	8950,00	▲
Еўра	11970,00	▲
Рас. руб.	270,00	◄
Укр. грыўня	1101,77	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 18°
Віцебск	+ 16°
Гомель	+ 18°
Гродна	+ 18°
Магілёў	+ 16°
Мінск	+ 15°

ISSN 1990 - 763X

АНЛАЙН-КАНФЕРЭНЦЫЯ

ЯКІЯ ДАКУМЕНТЫ ПАТРЭБНЫ ДЛЯ ПРЫЗНАЧЭННЯ ПЕНСІІ?

Сёння, **28 жніўня, у 11.00** на сайце Мінпрацы і сацабароны пачнецца **анлайн-канферэнцыя на тэму: «Падрыхтоўка і прадстаўленне дакументаў для прызначэння пенсій».**

Рашэнне аб прызначэнні пенсіі прымаецца на аснове комплекснай ацэнкі дакументаў, пададзеных органу па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Адсутнасць хаця б аднаго, на першы погляд, непатрэбнага, можа істотна паўплываць на памер пенсіі.

Якія дакументы неабходныя для прызначэння пенсіі? Што рабіць, калі дакументы страчаны? І наогул, хто іх павінен збіраць — орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, наймальнік або сам работнік?

Адказы на гэтыя і многія іншыя пытанні, звязаныя з падрыхтоўкай і прадстаўленнем дакументаў для назначэння пенсій, вы можаце атрымаць падчас анлайн-канферэнцыі ў **начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Наталлі Уладзіміраўны МУРАШКЕВІЧ, начальніка аддзела арганізацыі пенсійнага забеспячэння Ніны Міхайлаўны ЛУЗІНАЙ, начальніка аддзела пенсійнага заканадаўства Алены Васільеўны ГОМАРАВАЙ** і іншых спецыялістаў гэтага ўпраўлення.

■ Актуальнае пытанне

І ЗНОЎ ПРА «ТАЛЕРКІ»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Многія нашы чытачы тэлефануюць у рэдакцыю і пытаюцца, ці закране іх нядаўняя пастанова Савета Міністраў, калі антэна або кандыцыянер устаноўлены да ўступлення ў сілу гэтага дакумента. Нагадаем, гаворка ідзе пра пастанову Савета Міністраў ад 16 мая 2013 года № 384, якая зацвердзіла Палажэнне аб умовах і парадку ўсталявання на дахах і фасадах шматкватэрных жылых дамоў індывідуальных антэн і іншых канструкцый.

Дык ці будуць змагацца з «талеркамі» і як узгадніць праект іх установкі? На нашы пытанні адказаў **начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Эдмунд ГРЫШКЕВІЧ**.

Парадак размяшчэння індывідуальных антэн рэгулюецца, пачынаючы з 1994 года

— Па сутнасці, нічога новага ў дадзенай пастанове не змяшчаецца, — разводзіць рукамі наш суразмоўца. — Першы дакумент, які рэгулюе парадак размяшчэння антэн, з'явіўся ў Мінску яшчэ ў 1994 годзе. Рашэннем Мінскага гарвыканкама ад 10 сакавіка 1994 года № 164 было прадугледжана, што для ўстаноўкі індывідуальнай антэны грамадзянін павінен атрымаць згоду эксплуатуючай арганізацыі, замовіць праектную дакументацыю, прыцягнуць для мантажу антэны арганізацыю, якая мае ліцэнзію на гэты від дзейнасці, пацвердзіць установку антэны актам выкананых работ. Такое рашэнне было прынята ў мэтах прадухілення негатыўных умоў эксплуатацыі будынкаў, неўпарадкаванага ўсталявання індывідуальных антэн, пагрозы падзення з вышыні іх элементаў. СТАР 3

ЭЛЕКТРАМАБІЛЬ: ЦІХА, ЧЫСТА, ТАННА

Але праехаць у Беларусі можна будзе толькі 200 км

Кампаніі Audi, BMW, Mercedes ствараюць асобныя серыі электрамабіляў. Электрычнае аўто ўпэўнена заваёўвае новых прыхільнікаў. Плюсоў безліч. Паколькі еўрапейскае сёння — гэта беларускае заўтра, мы часу не губляем. Спачатку — сетка запраўак для электрамабіляў. Будзе сэрвіс — беларусы зацікавяцца альтэрнатыўным аўто. Беларусы зацікавяцца — з'явіцца попыт. З'явіцца попыт — будзе прапанова. Гэта актуальна.

«Японец» акрыляе

Падарылі электрамабіль Nissan Leaf. Шчасця — па самыя вушы. А як жа інакш? Блакітны хэтчбек, выкарыстоўваючы альтэрнатыўныя крыніцы энергіі, мае шэраг істотных пераваг. Едзеш у абсалютнай цішыні (аж заснуць можна). Рухавік магутны і паслухмяны. Машына разганяецца імгненна. Аніякіх расходаў на паліва. Забываешся пра ўзроўні масла, ахалоджванне радыятара. Карбюратар вечны. А яшчэ электрамабіль наваколле не забруджвае. Прырода кажа: «Вялікі дзякуй!»

Але лунаць у надхмар'і доўга не даводзіцца. Каментары спецыялістаў у сферы электрычнага абсталявання прымушаюць спусціцца на зямлю. Паводле слоў Канстанціна Шышкова, намесніка дырэктара фірмы «Эксімэлектра», уладальніку электрамабіля Nissan Leaf, як ні круці, смяяцца апошняму не наканавана. Максімальны прабег электрычнага аўто складае 200 кіламетраў без падзарадкі. Гэта прыкладна тыдзень бестурботнага катання па Мінску. Тыдзень скончыўся. Правакацыйнае пытанне: а што далей? Няўжо адзіны варыянт — накіравацца па слушныя парады на радзіму нашага падарунка, у Японію? Не, проста набіраемся цярпення, каб дачакацца моманту, калі запраўкі новага тыпу з'явяцца і ў Беларусі. СТАР 6

ДАСТОЙНЫЯ ДЗЯРЖПРЭМІЙ РАБОТЫ ТРЭБА ЎМЕЦЬ ВЫЯЎЛЯЦЬ

Прапановы па прысуджэнні дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 2012 года абмеркаваны ўчора на рабочай сустрэчы кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі з прэм'ер-міністрам Міхаілам Мясніковічам, старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Анатолем Рубінавым, кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэем Кабяковым і першым намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандрам Радзьковым. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

«Мы да гэтага часу ў даўгу перад таленавітымі людзьмі. Я маю на ўвазе дзяржаўныя прэміі Рэспублікі Беларусь. На жаль, магчыма, я не маю рацыі, але не было падстаў для падпісання адпаведных дакументаў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

На думку Прэзідэнта, у асноўным былі прадстаўлены слабыя работы. «І каб не памыліцца, я папрасіў вас прапрацаваць праект прапаноў па лаўрэатах дзяржаўных прэмій. Работа гэта праведзена, і я хацеў бы, каб мы падрабязна разгледзелі матэрыялы і меркаванні адпаведных структур і органаў улады, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Пры гэтым я вельмі прасіў бы вас, каб мы зыходзілі не з таго, што трэба прысвойваць дзяржаўныя прэміі і з горшага выбраць лепшае. Я зыходжу з таго прынцыпу, што калі няма вялікіх дасягненняў, то і прысвойваць нічога не трэба».

Аляксандр Лукашэнка пры гэтым заўважыў, што дастойныя гэтай прэміі работы, хутчэй за ўсё, ёсць, але іх трэба ўмець выяўляць. «І калі мы не можам прыняць такое рашэнне, значыць, тут няма сістэмнай работы. Гэта самае галоўнае», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Удзельнікі рабочай сустрэчы далажылі кіраўніку дзяржавы аб праведзенай рабоце і ўнеслі адпаведныя прапановы. Былі падрабязна абмеркаваны работы, якія прайшлі папярэдні шматступеньчаты адбор і грамадскае абмеркаванне, — тры ў галіне навукі і тэхнікі і тры ў сферы літаратуры, мастацтва і архітэктуры.

Канчатковае рашэнне аб прысуджэнні дзяржаўных прэмій у бліжэйшы час прыме Прэзідэнт Беларусі.

У БАРАЦЬБЕ З АЧС НЕАБХОДНА ПРАВІЛЬНА РАССТАЎЛЯЦЬ ПРЫЯРЫТЭТЫ

У вырашэнні праблемы з распаўсюджваннем афрыканскай чумы свіней (АЧС) у Беларусі неабходна дакладна расстаўляць прыярытэты. Гэтага запатрабаваў прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, паведамляе БЕЛТА.

На пасяджэнні абмеркаваны і ўхвалены праект пастановы ўрада, што прадугледжвае дадатковыя меры па ліквідацыі і недапушчэнні распаўсюджвання АЧС і іншых захворванняў жывёл. «Прапаную дакладна выбудаваць прыярытэты ў вырашэнні гэтай праблемы, — сказаў прэм'ер. — Сёння іх два, і першы заключаецца ў тым, каб спыніць бяду. Для гэтага не трэба шкадаваць ні сіл, ні сродкаў», — падкрэсліў кіраўнік урада. Другім прыярытэтам, на думку Міхаіла Мясніковіча, з'яўляецца выплата кампенсацый грамадзянам у сувязі з забоем або адабраннем свіней з-за АЧС. Для гэтага будзе зацверджаны адзіны парадак выплаты кампенсацый за канфіскаваных жывёл і аплаты за прадаваемае пагалоўе свіней на мясаперапрацоўчыя камбінаты, у тым ліку нетэхналагічнае пагалоўе (кныры, свінаматкі, маладняк вагой да 30 кг).

Міхаіл Мясніковіч закрануў найбольш актуальныя пытанні. У прыватнасці, з улікам існуючай сітуацыі прэм'ер прапанаваў банкам падставіць плячо пацярпелым ад афрыканскай чумы свіней комплексам і гаспадаркам, прадаставіўшы ім двухгадовую адтэрміноўку плацяжоў па выдадзеных крэдытах. Прэм'ер-міністр таксама лічыць мэтазгодным прадастаўленне крэдытаў для тых комплексаў або ферм, якія пацярпелі і дзе неабходна аднаўляць пагалоўе, на асаблівых ільготных умовах.

Асобную ўвагу кіраўнік урада засяродзіў на ўзвядзенні жывёльных могільнікаў. Нягледзячы на прынятыя ў рэспубліцы нормы, многія з іх будуюцца ў абыход усіх правіл.

БОЛЬШ ЧЫМ ПАЎКІЛАМЕТРОВЫ СЦЯГ З'ЯВІЦЦА Ў НЕБЕ НАД БЫХАВАМ

Ён разгорнецца за парашутыстам Паўлам Навіцкім. Гэта самае вялікае палотнішча не толькі ў Беларусі, але і ў краінах СНД і Балтыі. І такім своеасаблівым рэкордам будзе адзначаны Дзень беларускага пісьменства 1 верасня.

Першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Лілія АНАНІЧ адзначыла, што ў гэтага свята невыпадкова нацыянальны характар. Бо ўжо сёлета мы маем надзвычай добрыя вынікі на ніве айчыннага кнігавыдання. За першае паўгоддзе было надрукавана 5960 найменняў кніг агульным тыражом 15 мільёнаў экзэмпляраў. Аднак павышаецца не толькі іх колькасць, але і якасць. Як доказ таму намеснік міністра інфармацыі адзначыла, што ў верасні, пасля Свята пісьменства, прадстаўнікі нашай краіны паедуць атрымліваць Гран-пры міжнароднага конкурсу «Мастацтва кнігі», якое было прысуджана за кнігу «Полацк». Дыпломамі былі адзначаны і іншыя беларускія выданні, сярод якіх «Полацкае Евангелле», «Гісторыя беларускай чыгункі», «Беларусь сінявокая».

Навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да святыняў» з Дабрадатным Агнём ад Гроба Гасподняга пачне свой шлях ужо сёння, адкрываючы Свята беларускага пісьменства. У Кафедральным саборы адбудзецца святочнае богаслужэнне. Лілія Ананіч падсумавала:

— Ужо ў 20-ы раз па многіх гарадах, вёсках роднай Беларусі навукоўцы, асветнікі, дзеячы беларускай культуры, мастацтва разам з непагаснай лампадай духоўнасці панясуць слова пра нашу Бацькаўшчыну, пра тое, што мы сёння сцвярджаем разам, будуючы суверэнную Беларусь.

Выдавецкі дом «Звязда», газета «Звязда» будуць ладзіць міжнародны «круглы стол» па тэме «Сугучча: мова і літаратура ў кантэксце гісторыка-культурнай спадчыны» з удзелам беларускіх і замежных пісьменнікаў, пра што расказаў **дырэктар — галоўны рэдактар Алесь КАРЛЮКЕВІЧ**. Пройдзе і прэзентацыя праекта «Сугучча сэрцаў», які ўяўляе сабой 11 зборнікаў твораў беларускай літаратуры, перакладзеных на рускую мову, і літаратуры адной з краін СНД. Усё гэта стане падсумаваннем міжнародных стасункаў беларускіх пісьменнікаў.

Праграма Свята беларускага пісьменства разлічана на розны ўзрост і густ: ад самых маленькіх да людзей сталага

веку, ад аматараў даўніны да тэатралаў. На кожнай пляцоўцы дзействы будуць ісці цэлы дзень.

На адкрыццё басейна ў Быхаве завітае Аляксандра Герасіменя. На стэндзе «Магілёўскіх ведамасцяў» будзе прысутнічаць пісьменніца Вольга Батракова, творы якой выдаюцца масавымі тыражамі ў Беларусі і іншых краінах.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

■ Даходы

СЯРЭДНІ ЗАРОБАК У ЛІПЕНІ — 5,45 МЛН РУБЛЁЎ

Намінальныя налічаныя сярэднямесячныя заробкі работнікаў у студзені—ліпені сёлета склалі 4 868,9 тыс. рублёў, у тым ліку ў ліпені — 5 450,2 тыс. рублёў, паведамілі рэдакцыі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Спецыялісты падлічылі, што ў ліпені заробкі работнікаў павялічыліся ў параўнанні з чэрвенем на 5,6%, або на 290,3 тысячы рублёў.

Рэальная заработная плата (заработная плата, разлічаная з улікам росту спажывецкіх цэн на тавары і паслугі) у студзені—ліпені сёлета павялічылася на 20% у параўнанні з падобным леташнім перыядам, а ў ліпені ў параўнанні з чэрвенем гэтага года — на 4,6%.

Такім чынам, у ліпені ў прамысловасці сярэдняя заработная плата склала 5 956,1 тыс. рублёў, у будаўніцтве — 7 202,4 тыс., на транспарце і ў сувязі — 6 289,5 тыс., у сельскай гаспадарцы, паляванні і лясной гаспадарцы — 4 316,6 тыс., па сістэме адукацыі — 3 410,1 тыс., у тым ліку настаўнікаў — 4 013,5 тыс., прафесарска-выкладчыцкага складу — 5 463,3 тыс. рублёў. Зарплата работнікаў аховы здароўя і ў сферы сацыяльных паслуг у ліпені была ў памеры 3 884,9 тыс. рублёў, у тым ліку ў галіне аховы здароўя — 3 999,1 тыс. рублёў. Сярэднія заробкі ўрачоў склалі 6 517,3 тыс. рублёў, а сярэдняга медыцынскага персаналу — 3 840,8 тыс. рублёў.

Сяргей КУРКАЧ

■

ХТО НА ЛАСЯ, ХТО — НА АЛЕНЯ

З 1 па 30 верасня ў краіне адкрываецца паляванне на лася, высакароднага аленя, еўрапейскую лань, плямістага аленя.

— Здабываць дазваляецца дарослых самцоў, селекцыйных жывёл любога полу і ўзросту. Паляваць можна зброевым спосабам з засады, з падыходу, з падманваннем (на вабік) з 18 да 9 гадзін, — паведаміў «Звязде» старшы дзяржаўны інспектар Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету Вадзім Варабей. — Згодна з правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і паляванння, дазваляецца выкарыстоўваць наразную паляўнічую зброю з дульнай энергіяй кулі звыш 3 тысяч джоўляў і гладкаствольную паляўнічую зброю з выкарыстаннем толькі кулявых патронаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ВЕЧНЫ АРЛЕН

Сёння ў 11 гадзін у Палацы мастацтваў, што на вуліцы Казлова ў Мінску, адбудзецца развітанне з народным мастаком Беларусі, графікам Арленам Кашкурэвічам. Пасля цяжкай хваробы Арлен Кашкурэвіч пайшоў у лепшы свет на 84-м годзе жыцця 26 жніўня.

Але пасля сябе пакінуў шмат чароўных твораў мастацтва. Арлен Міхайлавіч — вядомы кніжны графік, яго малюнкамі аздоблены дзясяткі кніг. З ілюстрацыямі Кашкурэвіча выходзіла і «Дзікае паляванне караля Стаха» Уладзіміра Караткевіча, і «Найвышэйшая песня Саламонава», і «Фаўст» Гётэ, і «Песня пра зубра» Міколы Гусоўскага, і шмат іншых твораў сусветнай і беларускай літаратуры. Яго імя — брэнд беларускай кніжнай графікі. Ён быў кумірам і настаўнікам для многіх. Маючы свой адметны, рэалістычны, працяты тонкім псіхалагізмам стыль, Арлен Кашкурэвіч у сваёй творчасці заўжды ўздымаў надзвычай важныя для беларусаў пытанні. Гісторыя, культура, нацыянальнае, памяць, каханне, вера — пра ўсё гэта мастак гаварыў мовай штрыхоў і сілуэтаў. А яго схільнасць да манахромнай графікі заўсёды натхняе на думкі пра тое, што ў свеце насамрэч усё проста і што праўду ад хлусні, а дабро ад зла адрозніць не так і цяжка. Варта толькі захацець, вельмі пастарацца. Выдатнага беларускага мастака ўжо няма з намі на гэтай зямлі. Але таму мы павінны старацца яшчэ больш самаддана.

Смуткуем. Выказваем шчырыя спачуванні родным і блізкім.

Звяздоўцы.

■ Гучная справа

СПРАВА БЕЛАРУСКАЙ КАЛІЙНАЙ КАМПАНІІ ЯШЧЭ РАЗ ПАКАЗВАЕ СУТНАСЦЬ МЕТАДАЎ СУЛЕЙМАНА КЕРЫМАВА

Крымінальная справа, заведзеная ў дачыненні да топ-менеджменту ЗАТ «БКК», яшчэ раз паказвае сутнасць метадаў расійскага бізнесмена Сулеймана Керымава. Такое меркаванне БЕЛТА выказаў кіраўнік аналітычнага цэнтра ЕсооМ Сяргей МУСІЕНКА.

Эксперт адзначыў, што відавочна — за злачыннымі схемамі стаіць Керымаў. «Паглядзіце паслужны спіс Сулеймана Керымава. Ён заўсёды дзейнічаў такімі метадамі. Гэта не дзіўна. Гэта яго схемы. Успомніце, як ён прымаў папярэднія актывы», — сказаў Сяргей Мусіенка.

Кіраўнік аналітычнага цэнтра нагадаў аб спробе заплаціць «адкат» Прэзідэнту Беларусі з боку Керымава: «Усе помняць, як Керымаў зрабіў «заход» да Прэзідэнта Беларусі з дзіўнымі прапановамі, гэта значыць калі ён прапаноўваў узяць грошай. Пасля атрымання адмовы ён вырашыў дзейнічаць інакш».

Як паведамлялася, Следчы камітэт Беларусі расследуе крымінальныя справы ў дачыненні да службовых асоб ЗАТ «БКК», заведзеныя Генеральнай пракуратурай па ч.3 арт. 424 «Злоўжыванне ўладай і службовымі паўнамоцтвамі» КК. У тым ліку быў затрыманы старшыня наглядальнага савета гэтага ЗАТ — Уладзіслаў Баумгертнер.

СІТУАЦЫЯ З ЗАТРЫМАННЕМ БАУМГЕРТНЕРА ПОЎНАСЦЮ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ПРАВАВОЙ ПЛОСКАСЦІ

Аб гэтым паведаміў начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй САВІНЫХ, перадае БЕЛТА.

«Неабходна дакладна разумець, што сітуацыя, якая ўзнікла, поўнасцю знаходзіцца ў прававой плоскасці», — заявіў Андрэй Савіных. «Сітуацыя з затрыманнем з'яўляецца вынікам прававой ацэнкі дзеянняў канкрэтнай асобы. Для гэтага ёсць дастатковыя падставы і аргументаваная прававая кваліфікацыя. Размова ідзе аб значным эканамічным уроне інтарэсам Рэспублікі Беларусь», — адзначыў ён. У сувязі з гэтым Следчы камітэт, кіруючыся прынцыпам незалежнасці пры ажыццяўленні сваіх паўнамоцтваў, завёў адпаведную крымінальную справу і прыняў рашэнне аб затрыманні Уладзіслава Баумгертнера, растлумачыў Андрэй Савіных.

«Мы спадзяёмся, што гэта пытанне будзе разглядацца нашымі партнёрамі адказна, у духу законнасці, а не на падставе эмоцый і ўвязкі з палітыкай», — дадаў афіцыйны прадстаўнік МЗС Беларусі.

■

І ЗНОЎ ПРА «ТАЛЕРКІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Затым, па словах Эдмунда Грышкевіча, гэты парадак быў прапісаны ў Правілах карыстання жылымі памяшканнямі, утрымання жылых і дапаможных памяшканняў жылога дома ў Рэспубліцы Беларусь, зацверджаных у 1999 годзе загадам Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі № 177.

Далей было Палажэнне аб парадку перабудовы і перапланіроўкі жылых памяшканняў у шматкватэрных жылых дамах, зацверджанае пастановай Савета Міністраў ад 31 снежня 2006 года № 1805, згодна з якім для ўстаноўкі інжынернага абсталявання, да якога адносяцца і індывідуальныя антэны, трэба было браць дазвол мясцовага выканкама, абавязковымі былі распрацоўка праекта, заключэнне дагавора падраду на выкананне мантажных работ, прыёмка выкананых работ у эксплуатацыю з афармленнем адпаведнага акта.

Артыкулам 21.13 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях ад 21 красавіка 2003 года № 194-З за самавольнае пераабсталяванне ці іншае змяненне балконаў, лоджый і іншых архітэктурных і канструктыўных элементаў фасадаў жылых дамоў, усталяванне на фасадах, балконах, лоджыях, дахах спадарожнікавых і іншых антэн прадугледжаны штраф у памеры ад 2 да 15 базавых велічынь.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Гэтыя звесткі былі размешчаны ва ўсіх жыллёва-эксплуатацыйных арганізацыях на стэндах з інфармацыяй для насельніцтва, і людзі не маглі не ведаць пра забарону самавольнай установкі на дахах і фасадах жылых дамоў антэн і іншых канструкцый, — упэўнены начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі. — Аднак толькі ў сувязі з інфармацыяй аб фактах дэмантажу самавольна ўсталяваных антэн сёлета яны пачалі цікавіцца, як жа можна атрымаць дазвол.

Як атрымаць дазвол на самавольна ўсталяваную антэну

Такая магчымасць якраз і прадугледжана Палажэннем аб умовах і парадку ўсталявання на дахах і фасадах шматкватэрных жылых дамоў індывідуальных антэн і іншых канструкцый, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 16.05.2013 года № 384.

— Трэба адзначыць, што самавольная ўстаноўка індывідуальнай антэны можа быць вырашана толькі ў тым выпадку, калі выкананыя работы не ўплываюць на бяспеку будынка і адпавядаюць патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў, — дадае Эдмунд Грышкевіч.

Калі гэта так, то атрымаць дазвол не ўяўляе асаблівай цяжкасці. Для гэтага трэба падаць у мясцовы выканкам заяву, план-схему фрагмента фасада або даху з указаннем месцазнаходжання антэны, складзены ў адвольнай форме, а таксама тэхнічнае заключэнне, якое можа быць распрацавана праекціроўшчыкам. Пры сабе трэба мець пашпарт ці іншы дакумент, які сведчыць асобу, тэхнічны пашпарт і дакумент, які пацвярджае права ўласнасці на кватэру.

Далей ва ўзгоднены з вамі час прадстаўнікі арганізацыі, якая ажыццяўляе эксплуатацыю жыллёвага фонду, агледзяць фасад або дах па месцы ўстаноўкі антэны са складаннем акта тэхагляду. На падставе пададзеных вамі дакументаў і акта тэхагляду выканкам прыме адпаведнае рашэнне.

Святлана БУСЬКО.

■ Фінансавы выдатнік

АБЛІГАЦЫЯ — ТАКСАМА ВЫГАДНА

Наш фінансавы рынак прапануе не так шмат варыянтаў для памнажэння накопленых грошай, але альтэрнатыва ўкладам (дэпазітам) усё ж такі ёсць. І альтэрнатыва вельмі прымальная, часам нават больш прыбытковая, чым дэпазіт. Я маю на ўвазе аблігацыі.

Такія каштоўныя паперы бываюць двух асноўных відаў — дзяржаўныя і банкаўскія. Разгледзім спачатку апошні від. Аблігацыя, як сцвярджаюць банкі, якія іх выпускаюць,— гэта каштоўная папера на прад'яўніка (хаця бываюць і імянныя, але ў нас не распаўсюджаны), якая пацвярджае абавязацельствы банка пакрыць яе ўладальніку намінальны кошт аблігацыі ва ўстаноўлены тэрмін з выплатай працэнтнага даходу. Аднак, акрамя працэнтных, бываюць і дысконтныя аблігацыі — калі каштоўная папера купляецца па заніжаным кошце, а праз пэўны тэрмін банк аддае суму поўнага кошту (даходам лічыцца розніца паміж рэальнай і заніжанай цаной). Але працэнтныя аблігацыі, на мой погляд, больш прывабныя: калі выбраць правільна, то будзеце мець магчымасць перыядычна атрымліваць ужо налічаны даход, а таму не трэба будзе чакаць заканчэння тэрміну размяшчэння.

Дык на што ж тады абавязкова звяртаць увагу пры выбары аблігацыі? Па-першае, на намінал каштоўнай паперы — і на суму, і на валюту. На суму, бо вы павінны разумець, што аддасце свае грошы на вялікі тэрмін і карыстацца імі не зможаце, што вы маеце абсалютна свабодныя накапленні, якія вам раптоўна не спатрэбяцца. Звярнуць увагу на валюту варта таму, што зараз большым попытам і даходнасцю адзначаюцца аблігацыі ў замежнай валюце. Аднак нават калі вас будуць заклікаць да куплі валютнай аблігацыі, пераканайцеся ў тым, што купляць вы яе будзеце не за беларускія рублі і што выплачваць вам таксама будуць валюту. Зразумела, што вам неабходна будзе выбраць і найбольш цікавую для вас працэнтную стаўку.

Калі ўсё гэта вы высветлілі, то паглядзіце на тэрмін размяшчэння аблігацыі. Звычайна гэта 1 ці 2 гады (хаця бывае і больш — напрыклад, на 5 гадоў). Цяпер выберыце для сябе найбольш прымальны тэрмін. Натуральна, што чым даўжэй, тым большы даход. Але ў кожным асобным выпадку аб гэтым таксама папытайцеся. Калі і з гэтым пытаннем разабраліся, не спяшайцеся купляць аблігацыю. Высветліце, калі адбываюцца выплаты па аблігацыі. Гэта могуць быць выплаты працэнтаў адзін раз у тры месяцы, у паўгода ці яшчэ як. А можа і не быць выплат да канца тэрміну размяшчэння аблігацыі. Вам жа зручней будзе атрымліваць частку даходу да таго моманту, калі здадзіце аблігацыю, ці не так? Але кожны павінен падабраць для сябе самы зручны варыянт. У любым выпадку, розныя банкі прапануюць зусім розныя ўмовы. Майце гэта на ўвазе.

Асаблівую ўвагу звярніце на датэрміновае пагашэнне аблігацыі. А калі раптам вам спатрэбяцца вашы грошы, як кажуць, «пазарэз»? Вы будзеце вымушаны датэрмінова забраць свае грошы назад. Але гэта магчыма толькі праз пэўны тэрмін пасля пачатку абарачэння каштоўнай паперы, і ў кожнага выпуску аблігацый, у кожнага банка ён будзе розны. А ў кагосьці, можа і ўвогуле забраць нельга будзе. Хтосьці вам прапануе магчымасць пагашэння з выплатай працэнтаў за кожны дзень, пакуль аблігацыя была ў вас. Хтосьці — за кожны месяц (тады выгадней забіраць грошы на пачатку месяца а не напрыканцы, бо за няпоўны месяц нічога не атрымаеце). Хтосьці — толькі за тры. Сачыце за тым, каб у вас былі выгадныя ўмовы.

Яшчэ адна парада: паколькі аблігацыі «на прад'яўніка», то неабходна іх захоўваць у якім-небудзь бяспечным месцы. Бо калі іх у вас, не дай божа, украдуць, зламыснікі змогуць атрымаць грошы без ніякіх праблем. У любым выпадку, перапішыце нумары аблігацый. Гэта хоць неяк дапаможа, калі звернецеся ў банк, каб вярнуць свае грошы.

Другі від аблігацый — дзяржаўныя — маюць амаль такія ж характарыстыкі, як і банкаўскія. Розніца паміж імі заключаецца ў тым, што выплаты па дзяржаўных аблігацыях забяспечваюцца дзяржавай, а па банкаўскіх — у лепшым выпадку, актывамі самога банка. Майце гэта таксама на ўвазе.

***

ДАРЭЧЫ

Фізічныя асобы вызвалены ад выплаты падаходнага падатку з даходаў, атрыманых па аблігацыях.

Чакаем вашых пытанняў пра карыстанне грашыма і ўсё, што з гэтым звязана. Вы можаце звяртацца на электронны адрас газеты info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «для аддзела эканомікі» ці па тэлефоне 80172923802.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

Глен ХЭНЛАН:

«У КАМАНДНЫХ ВІДАХ СПОРТУ НЯМА АСОБНЫХ ГЕРОЯЎ. І Я НЕ ЧАРАЎНІК»

Вяртання канадскага трэнера ў беларускую зборную, здаецца, чакалі ўсе: кіраўнікі хакейнай федэрацыі, самі спартсмены, заўзятары. А ён, як і належыць прафесіяналу, прыляцеў — і адразу ўзяўся за работу. Хутка выбраў асістэнтаў (імі сталі Эдуард Занкавец і Алег Мікульчык), пачаў прагляд хакеістаў і не забыў сустрэцца з прэсай. Размову з журналістамі Хэнлан пачаў на рускай мове: «Я рады вярнуцца дадому і пачаць работу з беларускімі гульцамі». Харызматычная ўсмешка, крыху самаіроніі і высокая канцэнтрацыя прафесіяналізму — гэта, напэўна, і ёсць рэцэпт добрай гутаркі.

ПРАВЕРАНЫЯ БАЙЦЫ VS НАВАБРАНЦЫ

«Па вяртанні ў Мінск я заўважыў, што ўмовы ў хакеі сталі лепш. З іншага боку, пагоршыліся вынікі, але гэта няцяжка патлумачыць. Зараз у камандзе змена пакаленняў. Многія вопытныя хакеісты скончылі спартыўную кар'еру, а маладыя спартсмены яшчэ не паспелі сябе праявіць. І трэба сказаць вялікі дзякуй Андрэю Скабелку, які адважыўся ўзяць у зборную шмат маладых гульцоў. Бо заўсёды прасцей працаваць з праверанымі «байцамі». Цяпер шмат што будзе залежаць ад таго, наколькі хутка будуць прагрэсаваць навабранцы. Мяне часта пытаюцца пра стаўленне да «Дынама»… Хачу сказаць, што мне вельмі імпануюць трэнеры гэтага хакейнага клуба — Алег Мікульчык, Аляксандр Андрыеўскі, Любамір Покавіч. Яны ведаюць, як правільна працаваць з хакеістамі. Упэўнены, што маладыя гульцы будуць развівацца, удасканальвацца, выступаючы за клуб у КХЛ. А гэта вельмі карысна для зборнай».

АСНОВА КАМАНДЫ

«Безумоўна, касцяк зборнай будуць складаць хакеісты-легіянеры. Я ўжо перамовіўся з некаторымі хлопцамі, і ўсе яны шчаслівыя вярнуцца ў каманду. Трэба разумець, што яны маюць патрэбу ў асаблівай увазе з боку трэнераў. Да іх патрэбен асаблівы падыход. І, вядома, трэба выказваць павагу да гэтых гульцоў, якія ўжо шмат чаго дасягнулі ў сваёй кар'еры. Менавіта тады яны будуць адчуваць асаблівую адказнасць за сваю каманду. Дарэчы,

Фота БЕЛТА.

сустракаўся з Джэфам Платам. І ён вельмі хоча выступаць за беларускую зборную. Таму гэтаму хакеісту трэба працаваць удвая больш, каб з поўным правам атрымаць сваё месца ў камандзе. Ведаеце, натуралізацыя — гэта вельмі складанае рашэнне. Але калі форвард чатыры гады гуляе за адзін клуб і сапраўды горача жадае выступаць за нацыянальную зборную, гэта шмат пра што гаворыць. Ведаю, што Джэф старанна ўдасканальвае сваю рускую мову, таму, паверце, яму не будзе дазволена размаўляць у камандзе па-англійску. Хіба толькі са мной *(усміхаецца)*. Між іншым, я і сам вывучаю рускую мову, займаюся чатыры разы на тыдзень!».

МІХАІЛ ГРАБОЎСКІ: ПРЫЕДЗЕ ЦІ НЕ ПРЫЕДЗЕ?

«У апошнія дні шмат шуміхі вакол новага кантракта Міхаіла Грабоўскага. Вядома, я быў бы больш рады, калі б ён перайшоў у мінскае «Дынама». Але натуральна, што гулец такога ўзроўню, як Грабоўскі, хоча выступаць у НХЛ. Трэба паважаць рашэнне хакеіста, бо, выбіраючы каманду, ён кіраваўся не памерам зарплаты, а тым, дзе ён будзе больш шчаслівым. Трэнер «Вашынгтона» аддае перавагу атакуючаму хакею, таму Міхаілу ў новай камандзе будзе камфортна. Сезон вельмі доўгі, я чакаю, што Грабоўскі зможа пагуляць у адным звяне з Аляксандрам Авечкіным. Безумоўна, цяпер больш складана разважаць, ці прыедзе Міхаіл падтрымаць зборную на хатнім чэмпіянаце, але, трэба адзначыць, нацыянальная каманда кожнай краіны сустракаецца з падобнай праблемай. Спадзяюся, нам пашчасціць».

БЫЦЬ КАМАНДАЙ — ЗНАЧЫЦЬ ДУМАЦЬ І АДЧУВАЦЬ АДНОЛЬКАВА

«Я быў вельмі разгублены, калі пачуў, што чэмпіянат свету хочуць перанесці з Беларусі. Напэўна, вышэйшае кіраўніцтва не ведае, наколькі любяць хакей у гэтай краіне, наколькі тут неверагодныя заўзятары і цудоўныя ўмовы. Шчыра кажучы, ні на адным папярэднім планетарным першынстве я не бачыў такіх выдатных магчымасцяў! Таму мы з задавальненнем будзем чакаць на «Мінск-Арэне» замежных гасцей, каб яны адчулі абсалютна адмысловую атмасферу гэтага месца. Што датычыцца нашых задач на чэмпіянат… Скажу так: я мару стаяць за спінамі сваіх хлопцаў у чвэрцьфінальным матчы. Таму зараз буду рабіць усё магчымае, каб да сусветнага форуму хакеісты былі добра падрыхтаванымі. Каб запоўніць алімпійскую паўзу, магчыма, правядзём некалькі выставачных матчаў. Але перш за ўсё трэба стварыць у зборнай спрыяльную атмасферу, дзякуючы якой гульцы пачнуць думаць і адчуваць аднолькава. Менавіта гэта і значыць — быць камандай!».

САПРАЎДНЫ БАЕЦ

«Зусім хутка гадавіна катастрофы яраслаўскага «Лакаматыва», у якой загінуў Руслан Салей. У мяне засталося шмат добрых успамінаў пра гэтага ўнікальнага спартсмена. Але асабліва часта я ўспамінаю адзін выпадак. У адказным матчы ён правёў дзве хвіліны ў меншасці і вярнуўся на лаўку вельмі стомленым. Я запытаўся: «Ты як? Зможаш працягваць?». Руслан не адказаў «так» ці «не», а проста паглядзеў на мяне і сказаў: «Ніколі не пытайся, ці ў парадку я. Я заўсёды гатовы гуляць». Ён вельмі любіў хакей і быў сапраўдным байцом. Упэўнены, Руслан мог бы стаць вялікім трэнерам. У яго было ўсё для гэтага».

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

БЕЛАРУСБАНК

«Беларусбанк» с 27 августа 2013 года начал прием денежных средств в белорусских рублях во вклад «Гарантированный доход» сроком на 35 дней.

Доход по вкладу — 33% годовых. Ставка фиксированная.
Минимальная сумма вклада — 100 000 рублей. Пополнение вклада не производится.
Доход присоединяется к остатку вклада в день окончания срока хранения.
По истечении 35 дней автоматическая пролонгация на аналогичный период.
После пролонгации по вкладу возможны расходные операции в пределах остатка капитализированного дохода.

Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте и в отделениях «Беларусбанка»

Информация о процентах, выплаченных по различным видам вкладов, депозитов в течение последнего финансового года с разбивкой по месяцам размещена на сайте www.belarusbank.by
Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

ФЕСТЫВАЛЬНАЯ ГАВАНЬ РАСІІ

Анапа — адзін з найстаражытнейшых гарадоў Расіі: яго ўзрост — больш за дзве з паловай тысячы гадоў. Анапа — самы сонечны горад краіны: 286 дзён святла і цяпла за год. Анапа — гэта 8 відаў гаючых мінеральных водаў, 500 здраўніц і больш за 400 сучасных лячэбных метадык. Анапа — горад-свята, дзе штогод праводзіцца больш за 30 буйных фестываляў.

Найбольш яркі і маштабны з іх — фестываль Саюзнай дзяржавы «Творчасць юных» — праходзіць ужо восьмы раз, але ў Анапе — шосты. Сюды, на чарнаморскае ўзбярэжжа, прыязджаюць таленавітыя дзеці і падлеткі з Беларусі і Расіі. Сёлета ўпершыню да іх далучыліся прадстаўнікі з Казахстана.

Упершыню на фестывалі «Творчасць юных» адбылося цыркавое дзейства.

Узбярэжжа юных і таленавітых

На гэты раз у Анапу прыехалі 130 юных прадстаўнікоў з розных рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Усе яны — пераможцы міжнародных, нацыянальных і рэгіянальных конкурсаў. Некаторым калектывам нават прысвоена званне народных.

Заснавальнікі фестывалю — Парламенцкі сход Саюза Беларусі і Расіі, Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы, Міністэрствы культуры Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Арганізацыю мерапрыемства даручылі Цэнтру міжнародных конкурсаў (г. Масква) і Беларускай дзяржаўнай філармоніі (г. Мінск).

— Штогод геаграфія фестывалю пашыраецца за кошт рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі, — зазначыў **намеснік дзяржаўнага сакратара — член Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі Іван БАМБІЗА.** — Трэба адзначыць, што сёлета і сярод удзельнікаў фестывалю з Беларусі — прадстаўнікі са сталіцы, усіх абласцей і шматлікіх раёнаў краіны. Чырвонай ніткаю праз увесь фестываль павінна прайсці тое, што межы нашых краін умоўныя. Мы можам жыць у розных дзяржаўных упарадкаваннях, накіраваных на карысць чалавека, але добра разумець адзін аднаго. Сёння менавіта дзеці робяць першы крок да шматнацыянальных зносін — гэта мастацтва.

Кожны год унікальны тым, што тут збіраюцца ўсё новыя і новыя калектывы. Ва ўсіх іх свой, непадобны да іншых нумар. З цэнтральных пляцовак горада юныя дараванні разам з гледачамі далучаліся да вакальнага, харэаграфічнага, цыркавога, інструментальнага і іншых відаў мастацтва. Паколькі ўдзельнікі фестывалю выступалі ў розных жанрах, то амаль кожны стаў лаўрэатам у сваёй намінацыі.

— Сёлета на фестывалі ад Беларусі выступаюць 48 дзяцей з розных рэгіёнаў краіны, — расказвае **адзін з арганізатараў конкурсу, рэжысёр-пастаноўшчык Беларускай дзяржаўнай філармоніі Ніна ОСІПАВА.** — Спачатку яны прайшлі абласны адбор, затым за права ўдзельнічаць у фестывалі спаборнічалі на рэспубліканскім узроўні. Самым галоўным крытэрыем адбору стала выканаўчае майстэрства, падбор рэпертуару: паколькі ўсе канцэрты адбываюцца на адкрытым паветры, рэпертуар павінен быць фестывальным. Перавага даецца лёгкім жанрам. Усё павінна быць адаптавана да фестывальнай абстаноўкі.

Адным словам, сюды трапілі лепшыя з лепшых. Толькі і тут ім давялося паспаборнічаць, ужо не толькі з землякамі, а і з калегамі з іншых краін. Праўда, дух спаборніцтва і канкурэнцыі толькі дапаўняў атмасферу дзіцячага свята.

— Анапа — гасцінны горад, і анапчане ўжо звыкліся з тым, што тут праводзяцца шматлікія мерапрыемствы нацыянальнага і міжнароднага маштабаў, — падкрэсліў **мэр горада Сяргей СЯРГЕЕЎ.** — Час паказаў, што мы ўмеем іх праводзіць. Галоўная наша задача — зрабіць усё магчымае, каб удзельнікі фестывалю засталіся задаволенымі і каб той час, які яны правядуць у Анапе, запомніўся ім на ўсё жыццё.

І, хутчэй за ўсё, запомніцца. Аб'ядноўваючы беларускіх і рускіх дзяцей і падлеткаў праз далучэнне іх да скарбніц нацыянальных культур, фестываль «Творчасць юных» не толькі пашырыў гарызонты зносін, але і даў удзельнікам унікальную магчымасць удасканаліць выканаўчае майстэрства, стаў магутным імпульсам іх творчага развіцця.

Тэатр модаў «Паралелі часу» з Нефцеюганска — за захаванне мясцовых традыцый і абрадаў.

Анапчане-беларусы і ўшанаванне герояў

Фестываль Саюзнай дзяржавы ўжо даўно стаў святам для мясцовых жыхароў. Анапчане з нецярпеннем чакаюць жніўня, калі сюды прыедуць юныя артысты.

Нядзіўна, што ў дзень адкрыцця адна з цэнтральных плошчаў Анапы паступова напаўнялася мясцовымі жыхарамі і гасцямі горада. Спыняліся тут і тыя, хто проста праходзіў міма.

— А што тут адбываецца? — звяртаецца да мяне анапчанка Валянціна.

Я ёй расказваю пра фестываль, пра дзяцей з Беларусі, Расіі і Казахстана, пра тое, хто я і адкуль прыехала.

— Ды ў мяне муж — беларус! Я з сям'ёй доўгі час жыла на Брэстчыне, — узрадавалася жанчына, убачыўшы ва мне родную душу.

Затым пачала ўспамінаць добрае і спакойнае жыццё на беларускай зямлі. Менавіта тут, як прызналася жанчына, прайшлі яе самыя лепшыя гады. У Беларусі праляцела маладосць, тут выйшла замуж, нарадзіла дзяцей...

Пакуль гаварылі, удзельнікі фестывалю ўскладалі кветкі да манумента «Горад воінскай славы». Да іх далучыліся намеснік дзяржаўнага сакратара — член Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі Іван Бабміза і старшыня Муніцыпальнага аб'яднання горада-курорта Анапа Сяргей Сяргееў.

Валянціна Аляксандраўна расказала мне, што пачэснае званне «Горад воінскай славы» Анапе было прысвоена ў маі 2011-га года. Сёлета, напярэдадні Дня Перамогі, тут як сімвал прызнання была ўстаноўлена памятная стэла героям, якія абаранялі горад у перыяд руска-турэцкіх войнаў і падчас Вялікай Айчыннай вайны.

Цырымоніяй ушанавання подзвігу палеглых салдат і мірных жыхароў фестываль адкрыўся ўпершыню. Арганізатары палічылі, што дзеці павінны паважаць памяць тых, хто некалі аддаў жыццё за іх будучыню. Таксама нядрэнна было б ведаць гістарычнае мінулае славутай Анапы.

А гісторыя ў горада вельмі багатая. Тут, на беразе колішняй Сіндскай гавані, у VI стагоддзі да нашай эры існаваў грэчаскі поліс Сіндзіка. Праз дзвесце гадоў ён увайшоў у склад Баспорскага царства і пачаў называцца Гаргіпіяй. Жыхары антычнага горада гандлявалі, займаліся рамяством і мараплаўствам. Іх мірнае жыццё было парушана нашэсцем качавых плямёнаў, якія знішчылі горад.

Важнай вяхой у гісторыі Анапы стаў 1846 год. Менавіта тады яна атрымала статус партовага горада «для пасялення жыхароў гандлёвага і прамысловага класа». На мяжы XIX і XX стагоддзяў пачалася гісторыя Анапы як курорта.

У гэты перыяд доктар Уладзімір Будзінскі разгледзеў у прыморскім горадзе яго ўнікальныя лячэбныя фактары і адкрыў тут першы санаторый. Будзінскі стаў папулярызатарам Анапы: ён пачаў адкрываць тут здраўніцы з сучасным медыцынскім абсталяваннем, усталёўваў сувязі са свяціламі айчыннай медыцыны і арганізоўваў іх практыку на курорце. Так людзі пачалі прыязджаць у Анапу на адпачынак і лячэнне.

Сёння сапраўдным помнікам горада з'яўляюцца назвы яго вуліц. Многія з іх, асабліва ў цэнтры Анапы, названы ў гонар драгунскіх і казачых палкоў, якія геаічна вызначыліся пры штурме крэпасці ў 1832 годзе: Грэбенская, Астраханская, Уладзімірская...

Шмат пацярпела Анапа і падчас Вялікай Айчыннай вайны. У перыяд акупацыі яна мела для немцаў вялікае значэнне: горад стаў базай, якая злучала Таманскую групоўку гітлераўскіх войскаў з Крымам. Гэта быў адзіны порт на Каўказскім узбярэжжы, які выкарыстоўваўся ваенна-марскімі сіламі фашыстаў.

Больш падрабязна пра ваенную біяграфію горада-курорта юныя артысты даведаліся з вуснаў удзельніка ўсіх баёў у Анапе, старшыні Анапскага гарадскога савета ветэранаў, капітана 2-га рангу Анатоля Гапонава. Сказаў ён некалькі слоў і пра важнасць мерапрыемстваў Саюзнай дзяржавы:

— Маё пакаленне вырасла ў вялікай дружбе. Мы заўсёды лічылі, што немца зламала шматнацыянальная адзіная сям'я. Нягледзячы на тое, што сёння мы жывём у міры і спакоі, мы ўсё роўна павінны трымацца разам. Лепш, каб нас яднала не агульная бяда, а агульная радасць, свята.

Каля 300 ветэранаў апошняй вайны засталося ў Анапе. Сярод іх — і беларус Аляксандр Чыж, які родам з Бярозы. Сюды трапіў на службу ў армію і застаўся назаўсёды. Ажаніўся, выхаваў дзяцей. Пра Беларусь гаворыць са слязьмі на вачах: тут прайшло яго дзяцінства. Ваеннае дзяцінства. Яму было ўсяго 3 гады, калі пачалася вайна. Толькі ён усё памятае. Асабліва бацьку, які з вайны не вярнуўся...

Калейдаскоп маленькіх талентаў

Фестывальны горад грымеў! Са сцэны культурнага цэнтра «Радзіма» павявала дзяцінствам. Анапчане і госці горада падпявалі і падтанцоўвалі ўдзельнікам фестывалю, не пераставалі іх адорваць апладысментамі. А юныя таленты тым часам мітусіліся за кулісамі, хваляваліся і чакалі свайго выхаду.

Па-за гэтай мітуснёй у далёкім куточку на лавачцы сядзелі дзве прыгожыя дзяўчынкі-двайняткі, папраўляючы адна другой косы. Дуэт сясцёр Юліі і Таццяны Галавенкаў прыехаў на фестываль з Гродзеншчыны. Гэта ж трэба, у далёкай Анапе сустрэць зямлячак!

— Усё лета мы займаліся музыкай і вакалам, увесь час рэпетавалі, — наперабой расказваюць сястрычкі. — Толькі тут мы зразумелі, што гэта было недарэмна. Мы вельмі рады, што нас сюды запрасілі. Дахаты прыедзем з добрымі ўражаннямі і з марскім загарам (*смяюцца*).

Дзяўчаты — вучаніцы Гродзенскай дзіцячай школы мастацтваў імя Тызенгаўза. Разам са сваімі выкладчыкамі сёстры папулярызуюць традыцыі беларускай гітарнай школы. Акрамя музычнай школы, на працягу пяці гадоў яны займаюцца вакалам у эстраднай студыі «Міленіум». Юля і Таня — лаўрэаты шматлікіх абласных і міжнародных конкурсаў. Сёлета яны сталі стыпендыятамі Прэзідэнцкага фонду па падтрымцы таленавітай моладзі. На фестываль дзяўчаты прыехалі з матуляй. Яна — іх галоўны кіраўнік. Прывезлі з сабой некалькі нумароў вакал-дуэтам, а таксама выкананні на гітары.

Дзяўчынкі з калектыву танца сучаснай харэаграфіі «Ракета» з Ніжняга Ноўгарада ўпэўнены, што на фестываль прыехалі не па перамогу. Для іх галоўнае — удзел. Каму, як не ім, так думаць: нягледзячы на малы ўзрост, калектыў ужо сабраў цэлае сузор'е медалёў і званняў. Галоўнае іх дасягненне — званне «Заслужаны калектыў народнай творчасці Расійскай Федэрацыі».

Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь харэаграфічны ансамбль «Зорка».

Удзельнічалі ў фестывалі і «заслужаныя» з Беларусі — аматарскі калектыў, вакальна-харэаграфічны ансамбль «Зорка» з Віцебска. Гэтыя дзеці, якія выдатна выконваюць нацыянальныя танцы, добра вядомы беларусам. Яны — пастаянныя ўдзельнікі «Славянскага базару» і іншых маштабных мерапрыемстваў.

— Сёння ў калектыве займаецца 102 чалавекі ва ўзросце ад шасці да васямнаццаці гадоў, — дадала **кіраўнік ансамбля, уладальніца медаля Францыска Скарыны Наталля ЧАРНЮК.** — У рэпертуары «Зоркі» — танцы народаў свету, харэаграфічныя мініяцюры і характарныя танцы. Ёсць нумары і ў стылістыцы сучаснай харэаграфіі. Аднак самая вялікая ўвага ў калектыве надаецца нацыянальнаму беларускаму танцу. Невыпадкова амаль у кожным нашым касцюме прысутнічае нацыянальная сімволіка.

Дарэчы, упершыню ў фестывалі ўдзельнічаў калектыў, які не спяваў, не танцаваў, не іграў на музычных інструментах. Дзяўчаты з узорнага дзіцячага калектыву — Тэатра модаў «Паралелі часу» — пад музыку дэманстравалі касцюмы паўночнага народа ханты, якія яны пашылі сваімі рукамі. Такім чынам удзельнікі калектыву выказваюць пашану іх продкам, выступаюць за захаванне мясцовых традыцый і абрадаў.

Калектыў з'яўляецца неад'емнай часткай маленькага Югорскага гарадка з паэтычнай назвай Пыць-Ях, што ў перакладзе з мовы ханты азначае ці то «месца, дзе жывуць добрыя людзі», ці то «край, дзе нараджаюцца прыгожыя дзяўчаты». І сапраўды прыгожыя! У калектыве 120 дзяўчат ва ўзросце ад чатырох да васямнаццаці гадоў.

— Касцюмы шыем сваімі рукамі па ўзорах той вопраткі, якую насілі нашы продкі, — расказвае ўдзельніца калектыву Алена. — Для выцця выкарыстоўваем натуральнае футра і бісер. Вопратку робім калектыўна. На шыццё аднаго такога касцюма патрэбна затраціць прыкладна месяц. Акрамя таго, ствараем рускія народныя касцюмы і касцюмы ўсходніх нацыянальнасцяў.

Асаблівым поспехам карысталіся сумесныя расійска-беларускія нумары, пастаўленыя ў палявых умовах, літаральна за некалькі гадзін да канцэрта.

А пакарыў гледачоў дуэт саксафаністаў з Мінска. Павел Зыкаў і Павел Галееў настолькі віртуозна валодаюць інструментамі, ажно не верыцца, што ім толькі па 11 гадоў!

У 2007 годзе падлеткі паступілі ў Дзіцячую музычную школу № 14 у клас выкладчыка Анатоля Янчука. Два гады яны навучаліся на блокфлейце, а з 2009 года пачалі паспяхова засвойваць саксафон. «Пры ігры на флейце распрацоўваецца пальцоўка, расце рука. І толькі тады можна іграць на больш складаным інструменце», — тлумачыць Павел Галееў.

Хлопчыкі прызнаюцца, што працаваць дуэтам ім вельмі лёгка. І гэта нягледзячы на розныя характары: спакойны Павел Галееў і рухомы Павел Зыкаў выдатна дапаўняюць адзін аднаго. Паўлікі мараць паступіць у Расійскую акадэмію музыкі імя Гнесіных і сыграць з Народным артыстам Расіі Ігарам Бутманам.

...У маленькіх зорачак, якія сёлета загарэліся ў Анапе, ёсць усе шансы з часам ператварыцца ў вялікіх і сапраўдных зорак сцэнічнага мастацтва, здольных годна прадстаўляць у свеце нашу Саюзную дзяржаву.

Вераніка КАНЮТА.
Фота БЕЛТА.
Мінск — Анапа — Мінск.

МІНСК МОЖА СТАЦЬ КНІЖНАЙ СТАЛІЦАЙ СВЕТУ Ў 2017 ГОДЗЕ

Пра гэта паведаміў намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь Суша

Такое званне беларуская сталіца можа атрымаць дзякуючы таму, што ўжо менш чым праз 5 гадоў у нас будзе адзначацца 500-годдзе пачатку беларускага кнігадрукавання. У мінулую пятніцу ў Міністэрстве культуры праходзіла пасяджэнне працоўнай групы па падрыхтоўцы Мінска да гэтай намінацыі.

Такі статус зацвярджае ЮНЕСКА, і кожны год горад, што яго атрымлівае, мяняецца. Верагодна, Беларусь мае добрыя шанцы на перамогу сярод іншых намінантаў, бо юбілейная дата азначае пачатак не толькі беларускага, але і ўсходнеславянскага, усходнееўрапейскага кнігадрукавання.

Алесь Суша мяркуе, што гэты юбілей надзвычай важны, бо імя Францыска Скарына стала брэндам. Падзея можа стаць вельмі важным штуршком для таго, каб яшчэ раз узгадаць яго дзейнасць, творчасць, а з другога боку — ацаніць, якім чынам культура Беларусі была інтэгравана ў культурнае жыццё Еўропы таго часу, ды і ўсяго свету.

Пэўны час таму адзначалася 500-годдзе з дня нараджэння Скарыны. Дакладнай даты няма, але мерапрыемствы, што праводзіліся ў 1980-1990-х гадах, моцна паўплывалі на грамадска-палітычнае і культурнае жыццё краіны. Верагодна, гэтага трэба чакаць і праз 5 гадоў.

Статус творчасці Скарыны, мяркуе Суша, дазваляе дзейнасць па святкаванні юбілею перавесці на міжнародны ўзровень. Пэўныя даты варта ўнесці ў каляндар памятных дзён ЮНЕСКА.

Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі адзначае, што беларусам варта ўжо зараз добра задумацца, як адзначаць такую падзею, і кажа, што наперадзе вялікая праца, бо саміх выданняў Скарыны ў нас няшмат:

— У Беларусі спадчына Скарыны ў арыгінале прадстаўлена не ў поўнай ступені. У нашай краіне захоўваецца толькі 10 яго друкаваных выданняў. Усе яны былі аддрукаваны ў Празе. Захоўваюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Маецца таксама 2 рукапісныя спісы, натуральна, больш позняга часу. Аднак трэба адзначыць, што ў свеце выяўлена больш за 300 друкаваных выданняў Скарыны, ёсць звесткі пра больш чым 40 рукапісных спісаў. Усё гэта сведчыць пра тое, што Беларусь выглядае не самай багатай. Можна прыгадаць суседнія краіны, напрыклад, Расію, дзе выданні нашага першадрукара прадстаўлены нашмат шырэй. Таму неабходна рабіць захады па вяртанні спадчыны Францыска Скарыны. Спробы вярнуць асобнікі яго твораў з фондаў іншых дзяржаў вялікага эфекту не дадуць, і гэта заканамерна. Але ж выданні Скарыны, хоць і не часта, але з'яўляюцца ў прыватных уладальнікаў, якія маюць намер іх прадаць. У гэтай сітуацыі Беларусь павінна дзейнічаць актыўна, імкнуцца папаўняць сваю калекцыю, што мы зараз і робім. Прынамсі, такую інфармацыю мы маем і імкнёмся здзяйсняць адпаведныя крокі.

Размова вялася і пра іншыя спосабы вяртання спадчыны Скарыны — электронныя копіі, факсімільныя выданні. Разглядаецца магчымасць часовага вяртання — арганізацыі кніжных выстаў выданняў Скарыны, якія захоўваюцца за мяжой. Такая спроба была зроблена летась, калі 11 кніг Скарыны з германскага горада Гётгенс былі перададзены на часовае экспанаванне.

Абмеркаванне 500-годдзя юбілею пачатку беларускага кнігадрукавання адбывалася на адным з мерапрыемстваў XV Міжнароднага з'езда славістаў. Прадстаўнік чэшскай дэлегацыі Юрый Марван адзначыў:

— Пра гэтую гадавіну варта сур'ёзна падумаць, бо яна можа адыграць важную ролю ў самасвядомасці беларускага народа. Важна, каб пра гэта даведаліся дзеці, каб усе ідэі, звязаныя са Скарынам, трапілі ў сярэднюю школу, сталі часткай навуковага плана. Трэба гэтую падзею зрабіць агульнай ідэяй усяго грамадства. І гэта сапраўды справа не толькі Захаду ці Усходу: навуковы досвед пераканаў мяне, што беларуская мова — у першую чаргу еўрапейская, а пасля ўжо ўсё астатняе. У дакументах XVI стагоддзя я ўбачыў, што чэхі абмяркоўвалі вашу мову і дакладна цытавалі беларускія сказы.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

БАБРУЙСК АДЗНАЧЫЎ ЭКАЛАГІЧНЫЯ «ДАЖЫНКІ»

Завяршыў працу XI Рэспубліканскі экалагічны форум, фінал якога праходзіў гэтымі днямі ў Бабруйску. У горадзе над Бярэзінай сабраліся работнікі прыродаахоўных службаў краіны, прадстаўнікі СМІ і грамадскіх аб'яднанняў, члены ўрада Рэспублікі Беларусь, прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, творчыя калектывы. Форум, арганізатарам якога з'яўляецца Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі, праходзіць штогод, пачынаючы з 2003 года, з мэтаю кансалідацыі і актывізацыі ўсіх слаёў грамадства ў рашэнні праблем аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў, а таксама максімальнага ахопу грамадзян рэспублікі ў экалагічны рух, павышэння экалагічнай культуры насельніцтва і прапаганды прынцыпаў устойлівага развіцця.

Дэлегацыі з усіх абласцей краіны і Мінска, у склад якіх, акрамя службовых асоб, увайшлі і пераможцы рэспубліканскіх конкурсаў на экалагічную тэму, «інспектавалі» шэраг прадпрыемстваў Магілёўшчыны, на якіх забяспечваецца эфектыўная праца па кантролі за выкідамі ў паветра, глебу і ваду шкодных рэчываў. Паралельна з наведваннем аб'ектаў Магілёўскага, Асіповіцкага, Бялыніцкага, Шклоўскага, Кіраўскага, Глускага раёнаў і горада Магілёва, быў арганізаваны семінар «Нацыянальная практыка па рэалізацыі рэгіянальных схем устойлівага кіравання камунальнымі адходамі». Наогул гэты форум праводзіўся ў тры этапы. Мерапрыемствы стартавалі з пачатку красавіка, і вось фінал. За мінулы час было арганізавана і праведзена вялікая колькасць розных акцый, фестываляў, канферэнцый, мерапрыемстваў для прэсы, канцэртных праграм, рэспубліканскіх конкурсаў экалагічнай накіраванасці.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Нягледзячы на тое, што неба суботняга дня над Бабруйскам не абяцала сонейка і час ад часу пачынала «плакаць», мерапрыемствы фінальнага этапу форума прайшлі па запланаваным сцэнарыі. Адбылося ўрачыстае шэсце дэлегацый у святочных калонах, ускладанне вянкоў да помніка генералу Б.С. Бахараву, святочны канцэрт удзельнікаў мастацкай самадзейнасці горада. Адчынілася спецыялізаваная выстаўка «Сучасныя тэхналогіі ў галіне аховы і выкарыстання прыродных рэсурсаў». Камунальная служба Бабруйска правяла прэзентацыі першай пляцоўкі ў горадзе для асобнага збору другасных матэрыяльных рэсурсаў, створанай з улікам еўрапейскага вопыту і першага экалагічнага дворыка.

У час свята ў Бабруйску з'явілася новая алея (гэта ўжо традыцыя падчас форумаў закладваць новыя алеі). А на адным з участкаў Бярэзіны адбылося зарыбленне маладняком сцерлядзі.

Па традыцыі не абышлося без узнагароджванняў пераможцаў конкурсаў. Міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Уладзімір Цалка асабіста ўручыў дыпломы аўтарам праектаў і прадстаўнікам лепшых экалагічных і прыродаахоўных калектываў 2013 года, а таксама журналістам, якія цікава асвятлялі праблемы захавання матухны-прыроды. І фотамастакам, якія здолелі спыніць самыя непаўторныя і надзвычай чароўныя імгненні жыцця роднай зямлі.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара

Ліквідавалі падпольную вытворчасць і гандаль «спайсам»

Аператыўнікі ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі ГУУС Мінгарвыканкама разам з калегамі з Ленінскага РУУС, спецпадраздзялення «Алмаз» і байцамі раённага аддзела дэпартамента аховы МУС затрымалі двух мінчан, якія займаліся падпольным гандлем сумесямі для курэння.

У поле зроку праваахоўнікаў маладыя людзі, аднаму з якіх было 25 гадоў, другому — 23, трапілі якраз падчас спробы рэалізацыі чарговай партыі так званых «спайсаў», якія да месца прызначэння дастаўлялі на аўтамабілі. Пры аглядзе транспартнага сродку, які належаў старэйшаму з прыяцеляў, аператыўнікі знайшлі 600 грамаў «міксаў», якія змяшчалі ў сваім саставе псіхатроп метанон. Па месцы жыхарства затрыманых у 23-гадовага грамадзяніна было канфіскавана яшчэ 150 грамаў гатовых да продажу сумесяў, 205 грамаў парашку для вытворчасці «спайсаў», неабходнае для гэтага абсталяванне і больш за пяць грамаў небяспечнага псіхатропнага рэчыва. Акрамя тавару, затрыманы і аўтамабіль, на якім наркадылеры перавозілі свой тавар. У далейшым ён будзе канфіскаваны. Застаецца дадаць, што 25-гадовы кіроўца гэтай машыны да гэтага ўжо быў асуджаны за аналагічнае злачынства, а яго 23-гадовы прыяцель меў судзімасць за крадзеж.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Кватэрнае пытанне

ВЫСЯЛЯЙЦЕ. ПРАЗ ГОД

Мне на праве ўласнасці належыць двухпакаёвая кватэра. Былы муж удзелу ў прыватызацыі не прымаў. Ён п'е, пастаянна скандаліць, пагражае... Даводзіцца выклікаць міліцыю. А выселіць яго я, атрымліваецца, не магу?

В.А., *г. Магілёў.*

Магчыма, у дадзеным выпадку гаворка ідзе пра былога члена сям'і, якому дадзена права валодання і карыстання жылым памяшканнем і які можа быць выселены з гэтага жылля толькі праз адзін год з даты ўваходжання ў сілу Жыллёвага кодэкса.

Паводле п. 5 арт. 221 ЖК былыя члены сям'і ўласніка жылога памяшкання, якія не маюць долі ў праве агульнай уласнасці на гэта жылое памяшканне, якім прадастаўлена права валодання і карыстання гэтым жылым памяшканнем да ўваходжання ў сілу Кодэкса (2 сакавіка 2013 г.), пасля заканчэння аднаго года з даты ўваходжання яго ў сілу могуць быць выселены з гэтага жылога памяшкання па падставах, прадугледжаных абзацам чацвёртым п. 1 арт. 85 ЖК.

Абзацам чацвёртым п.1 арт. 85 ЖК прадугледжана, у прыватнасці, што падлягаюць высяленню ў судовым парадку без выдзялення іншага жылога памяшкання па патрабаванні ўласніка жылога памяшкання або іншых зацікаўленых асоб паўналетнія члены, былыя члены сям'і ўласніка жылога памяшкання, якія пражываюць сумесна з ім і не маюць долі ў праве агульнай уласнасці на займанае жылое памяшканне, або іншыя грамадзяне, якія пражываюць сумесна з гэтым уласнікам, якія на працягу года тры і больш разоў прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне правіл карыстання жылымі памяшканнямі, утрымання жылых і дапаможных памяшканняў, якое выявілася ў разбурэнні, псаванні жылога памяшкання альбо ў выкарыстанні яго не па прызначэнні, або за іншыя парушэнні патрабаванняў ЖК, якія робяць немагчымым для іншых пражыванне з імі ў адной кватэры або ў адным жылым доме, былі папярэджаны ўласнікам аб магчымасці высялення без выдзялення іншага жылога памяшкання і на працягу года пасля такога папярэджання прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці за аналагічныя правапарушэнні.

Віктар САВІЦКІ

■ Факт

З воінскай пашанай

У Чавускім раёне каля вёскі Дужаўка пахавалі астанкі 30 салдат, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

У жалобнай цырымоніі бралі ўдзел прадстаўнікі Ніжагародскай вобласці. Справа ў тым, што ўлетку 1941 года ў Беларусь накіравалі 160-ю стралковую дывізію, якая складалася з жыхароў горада Горкага (цяпер Ніжні Ноўгарад). Эшалон з чырвонаармейцамі разбамбілі ў Чавускім раёне, дывізія выходзіла з акружэння. Пошук воінаў, якія загінулі ў першы год вайны, разам з беларускімі калегамі вялі ўдзельнікі ваенна-патрыятычнага клуба «Рассвет» Ніжагародскай вобласці. Знойдзеныя астанкі пахавалі з воінскай пашанай пасля адпявання, здзейсненага праваслаўным святаром.

Ілона ІВАНОВА.

Прафтэхустановы чакаюць...

Прыём дакументаў на большасць прафесій будаўнічага профілю падоўжаны ў сталічных ПТВ да 15 верасня.

Па стане на 23 жніўня мінскія каледжы і ліцэі ўкамплектаваліся на 92%. Не вельмі ахвотна моладзь ішла сёлета вучыцца на муляраў, стропальшчыкаў, бетоншчыкаў, абутнікоў, швейнікаў... Між іншым, самымі востраэфіцытнымі для Мінска з'яўляюцца менавіта спецыялісты будаўнічага профілю, што звязана з вялікімі аб'ёмамі будаўніцтва ў сталіцы жылля, сацыяльных і спартыўных аб'ектаў. Праўда, свае карэктывы ў прыёмную кампанію ўнесла і дэмаграфічная сітуацыя. Прыкладна трэцюю частку маладых людзей, якія падалі свае дакументы ў сталічныя ўстановы сістэмы прафтэхадукацыі, складаюць іншагароднія абітурыенты.

Надзея НІКАЛАЕВА

...ЦІХА, ЧЫСТА, ТАННА

Nissan Leaf: у Беларусі такі пакуль толькі адзін.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Тым больш сёлета «Беларусьнафта» падае рэальныя надзеі ў гэтым плане. Бліжэйшым часам пабудуюць адну запраўку для электрычных аўто ў Мінску і дзве — у Гомелі. Пакуль за тэндар на закупку абсталявання змагаюцца найлепшыя нямецкія кампаніі, нам грэх сядзець склаўшы рукі. Самы час разбірацца ў дэталях тэхнічнага прадукту, каб зразумець: з чым навінку есці нам, беларусам?

ГОЛАЯ ПРАЎДА ЭЛЕКТРАМАБІЛЯЎ

Спачатку развеем міф. Пералічыўшы ўсе важкія плюсы электрычнага аўто, міжволі складваецца ўражанне: электрамабіль — дасканаласць, ідэальна чысты транспарт. Канстанцін Шышкоў сцвярджае адназначна: «Гума для колаў, разнастайныя пластыкі — усё гэта хімічнай вытворчасці. Таму ідэальным транспартам нават электрамабіль назваць нельга. Ідэальны транспарт — гэта конь. На 100% экалагічны». Конь? Як весела! Не, няхай застаюцца на іпадромах. Мы ж ідзём у заўтра, дзе электрычнае аўто — варыянт вельмі прывабны.

Электрамабілі з неба не ўпадуць. Адным цудоўным ранкам беларусы не прачнуцца з назойлівай ідэяй, не пабягуць масава купляць электрычныя аўто. Сярэдні жыхар не заўсёды можа купіць нават патрыманую традыцыйную машыну. Толькі расійскі аўтапрам з мадэлямі да 10 тысяч долараў застаецца даступным усім і кожнаму. Бяры — не хачу! Але ж вочы загараюцца на іншамаркі...

На многія мадэлі электрамабіляў яшчэ не так даўно цэны былі касмічныя: ад 200 да 350 тысяч еўра. Цяпер кошт тэхнічнага цуду — прыблізна 40-50 тысяч долараў. Так, BMW прэзентавала новы электрамабіль «i3». Налета яго можна будзе набыць за 42 тысячы долараў. 45 тысяч долараў за электрамабіль?! Яны звар'яцелі! Немец будзе плаціць 30, бо 15 за яго заплаціць дзяржава. Як субсідыю, датацыю. А беларусу застаецца пачакаць, калі з новымі мадэлямі нагуляюцца там, у Еўропе. Пакуль жа патрыманых няма ўвогуле. Практыка карыстання электрамабілямі бедная зусім. Калі звычайных аўто некалькі мільёнаў за год выпускаецца, то электрамабіляў — некалькі дзясяткаў тысяч. Таму рынак яшчэ не насычаны патрыманым цудам тэхнікі. Цуд дастаткова свежы, каб надакучыць немцам ці шведам. Тым больш свежы, каб зламацца.

Выпуск электрамабіля — вельмі рызыкоўны ход. «Хто не рызыкуе, той не п'е шампанскага», — скажаце вы. Але, паверце, ёсць выключэнні. Інвестары электрамабіляў рызыкуюць штодзень, і шампанскае ім толькі сніцца. Чаму? У сферы электрычных аўто пастаянна адбываюцца не проста абнаўленні, але ноу-хау, скачкі. Учора вы зараджалі акумулятар 10 хвілін. Сёння яго можна зараджаць 3 хвіліны. Аўто, выпушчаныя з падтрымкай акумулятара, які зараджаецца 10 хвілін, адразу ж становяцца па-за трэндам. Іх эра скончылася, не паспеўшы пачацца. А гэта было месяц таму. Казачныя інвестыцыі панёс вецер. Вядома, людзі будуць карыстацца. Але вытворцы кінулі грошы ў тое, што застарэла, ледзь паспеўшы нарадзіцца. У інвестараў заўсёды ёсць планы на будучыню. Затраты на выпушчаную серыю электрамабіляў павінны акупляцца за пэўны час. Але часта не акупляюцца. Вытворцам застаецца кусаць локці.

БУДУЙЦЕСЯ, ЗАПРАЎКІ, ВЯЛІКІЯ І МАЛЕНЬКІЯ

Адчыняем акно ў Германію і разумеем: на кожным кроку прагрэс. Сёлета ў Еўропе канчаткова замацавалі ўніверсальны стандарт раз'ёмаў для зарадкі. Раней былі японскі, амерыканскі і некалькі еўрапейскіх стандартаў (хуткая зарадка, марудная). «Нямецкая фірма Mennekes, якую мы прэзентуем у Беларусі, зрабіла адзін агульны раз'ём, які падтрымлівае адначасова ўсё. І еўрапейскія службы зацвердзілі за Mennekes статус манапольнага вытворцы на зарадкі для аўтамабіляў. Сінія разеткі Mennekes — цяпер афіцыйныя. І ў Беларусі электрамабілі будуць выкарыстоўваць менавіта іх», — адзначае намеснік дырэктара фірмы «Эксімэлектра».

А пакуль будуем асаблівыя запраўкі. У Беларусі цяжкасці сканцэнтраваліся ў інфраструктуры, распрацоўцы. Як той казаў, молада-зелена... Няма вопыту ў сферы наладжвання аўтаматыкі. Добра, а чым нямецкі вопыт нам не вопыт? На практыцы атрымліваецца так, што мы сапраўды не можам запазычыць еўрапейскі досвед. Усё выглядае проста толькі тэарэтычна. Справа яшчэ і ў тым, што пераймаць чужы досвед карыстання электрамабілямі не тое каб зусім не лагічна, але... Гэта як лезці ўперад бацькі ў пекла. У любым выпадку адбудзецца скачок. Мы павінны імгненна адрэагаваць на яго, перахапіць найноўшае... на чужы ўзровень... Карацей кажучы, не за адзін дзень такое робіцца, не за адзін год нават.

«Цяпер маем трохгадовы план. Галоўнае — гэта пабудаваць інфраструктуру, распрацаваць ідэальную для беларусаў сістэму ўліку. Далей з'явяцца іншыя пытанні», — паведамляе Канстанцін Шышкоў. Выдатна, давайце думаць пра сістэму разлікаў. Вось пад'язджаем на імправізаваную запраўку, спыняем наш сімпатычны электрамабіль і адразу ж сутыкаемся твар у твар з пытаннем аўтаматызацыі. Як лічацца кілаваты? Хто за нашымі дзеяннямі сачыць будзе? Нявожо аператары ўдзень і ўначы будуць стаяць над душою кожнага кліента? Падыходзім да вадкакрышталічнага экрана, каб выбраць колькасць электраэнергіі для запампоўвання. А на вуліцы мінус 25. Гэта ж не Італія. Што рабіць? Як электронная сістэма ўліку выжыве ў спартанскіх умовах нашага надвор'я? А яшчэ... людзі. Хапае тых, хто заўжды гатовы што-небудзь падрапаць, адкруціць. Рамонт высокай тэхнікі яўна не капейкі каштуе. У нашага ж чалавека рукі свярбяць даволі часта. Як быць?

Максімальны прабег электрычнага аўто складае 200 кіламетраў без падзарадкі. Гэта прыкладна тыдзень бестурботнага катання па Мінску. Тыдзень скончыўся. Правакацыйнае пытанне: а што далей?..

Верагодна, не сёння-заўтра з'явіцца магчымасць яшчэ больш спрасціць зараджальнае абсталяванне. Калі ж выпусцяць новыя батарэі, то, вобразна кажучы, хавайся ў бульбу. Праз месяц колішнюю навінку назавуць сівой старажытнасцю. З еўрапейскіх станцый мінулую аўтаматыку выкінуць на сметнік. Пакуль мы прыйдзем

Добра, пабудавалі мы інфраструктуру. Зноў пытанне грошай. Няхай адна заправачная станцыя для электрамабіляў будзе каштаваць 10 тысяч еўра. Калі ж на ёй будзе заряджацца 5 аўто за дзень, нават праз 10 гадоў яна не акупіцца... Атрымліваецца, гэта ўклад з разраду «каб было». Абсалютна нявыгадна ў плане бізнесу. Але тут не аб прыбытку ідзе гутарка. Гэта справа іміджу краіны. Пытанне падымалася, каб менавіта да чэмпіянату свету па хакеі ўсё зрабіць. Але доўга думаць не давялося. Мяжа ў нас не Германія — Беларусь. Не, паміж намі яшчэ Польшча і Літва, дзе электрамабіляў няма. Зразумела, адлегласць, дзе адсутнічаюць электрычныя зараджальнікі, надзвычай вялікая. Яўна перавышае 200 кіламетраў. Таму як шчаслівая сям'я немцаў не можа сесці ў аўто ў Берліне і прыехаць у Мінск, так і беларусы да Германіі на электрамабілі не даедуць. Мы яшчэ далёка не сёння ўвечары зможам сесці ў сталіцы і заглушыць рухавік дзесьці пад Барысавам. Ніхто не марыць пра Берлін. Нам хопіць Барысава.

НА ПАЗІТЫВЕ

Ёсць крама — мы ходзім у яе, няма — не ходзім. Так і з электрамабілямі: ёсць — ездзім. І яны будуць. Перш-наперш з'явяцца ў камунальных службаў. У Швецыі грамадскія электрамабілі ад Volvo — ужо не мара, а рэальнасць (на дарогі выпушчана 7700 адзінак). Маюць рацыю тыя, хто матаюць на вус.

Нафтавыя свідравіны яўна не гумовыя. Даволі хутка і багатыя на чорнае золата, і бедныя ў гэтым плане краіны апынуцца ў аднолькавым становішчы. Тады чалавецтву, апрача веласіпедаў і коней, застануцца электрамабілі. У гарадах стане цішэй і чысцей. Пачнём дыхаць напоўніцу. А яшчэ больш ацэнім сонца як альтэрнатыўную крыніцу энергіі. Што ж... будзем жартаўліва заяўляць: «Маё аўто любіць сонейка. Яно на ім ездзіць».

Маргарыта СІДАР.

Минский районный исполнительный комитет 27 сентября 2013 г. проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка	Целевое назначение	Инженерная инфраструктура *	Расходы по подготовке документации (рублей)	Начальная цена земельного участка (рублей)	Задаток (рублей)
1	Горанский с/с, д. Дуброва	623681304101000093	0,1500 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	-	5 287 543	90 000 000	18 000 000
2	Горанский с/с, п. Звенячи	623681306101000075	0,0666 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество	5 620 386	37 000 000	7 400 000
3	Горанский с/с, д. Казаки	623681307601000037	0,0936 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество	4 761 684	25 000 000	5 000 000
4	Горанский с/с, д. Капличи	623681308601000047	0,1500 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	-	5 014 861	138 000 000	27 600 000
5	Ждановичский с/с, д. Дегтяревка, участок № 6	623681702101000293	0,1254 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество, газ, водопровод	5 487 820	291 000 000	58 200 000
6	Ждановичский с/с, аг. Ждановичи, участок № 1	623681702601002262	0,1376 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество	2 984 803	498 000 000	99 600 000
7	Ждановичский с/с, аг. Ждановичи, участок № 2	623681702601002263	0,1400 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество	2 984 803	507 000 000	101 400 000
8	Ждановичский с/с, аг. Ратомка, участок № 1	623681708601002871	0,0783 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	-	3 023 135	99 000 000	19 800 000
9	Ждановичский с/с, аг. Ратомка, ул. Заславская, участок № 1	623681708601002870	0,0935 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	-	3 563 492	230 000 000	46 000 000
10	г. Заславль, ул. Молодечненская, 1	623650100001004695	0,1000 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество, газ, водопровод	4 796 330	147 000 000	29 400 000
11	г. Заславль, ул. Рогнеды	623650100001004691	0,1180 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество, газ, водопровод	4 964 520	241 000 000	48 200 000
12	Крупицкий с/с, д. Столбуновичи	623683909101000132	0,1490 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество, водопровод	4 887 293	66 000 000	13 200 000
13	Петришковский с/с, д. Недреска	623685706601000160	0,1380 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество	300 000	90 000 000	18 000 000
14	Петришковский с/с, д. Новашино	623685707101000289	0,1053 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество	300 000	55 000 000	11 000 000
15	Петришковский с/с, д. Новашино	623685707101000316	0,1557 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество	300 000	80 000 000	16 000 000
16	Петришковский с/с, д. Новашино	623685707101000323	0,1520 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество	300 000	80 000 000	16 000 000
17	Петришковский с/с, аг. Петришки	623685707601000686	0,1451 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество, газ, водопровод	300 000	110 000 000	22 000 000
18	Петришковский с/с, д. Светлый Путь	623685708101000074	0,1091 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество, водопровод	300 000	55 000 000	11 000 000
19	Петришковский с/с, д. Шубники	623685709601000278	0,1383 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество, водопровод	300 000	160 000 000	32 000 000
20	Сеницкий с/с, д. Скориничи, участок № 29	623686606101000200	0,1502 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	-	450 000	140 000 000	28 000 000
21	Сеницкий с/с, д. Скориничи, участок № 51	623686606101000162	0,1395 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	-	450 000	130 000 000	26 000 000
22	Сеницкий с/с, д. Скориничи, участок № 52	623686606101000167	0,1395 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	-	450 000	130 000 000	26 000 000
23	Хатежинский с/с, д. Богушово, ул. Горная	623687500601000194	0,1250 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	-	3 179 250	90 000 000	18 000 000
24	Хатежинский с/с, аг. Хатежино, участок № 190	623687508101000761	0,1550 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	-	2 007 950	190 000 000	38 000 000
25	Щомыслицкий с/с, д. Заболотье	623688003101000269	0,1817 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество	2 672 685	217 000 000	43 400 000
26	Щомыслицкий с/с, д. Новый Двор, участок № 13	623688005101000134	0,1491 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	-	5 195 650	136 000 000	27 200 000
27	Щомыслицкий с/с, д. Новый Двор, участок № 22	623688005101000135	0,1352 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	-	-	124 000 000	24 800 000
28	Шомыслицкий с/с, д. Прилукская Слобода, участок № 1	623688006601000487	0,1500 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	-	5 138 350	243 000 000	48 600 000
29	Шомыслицкий с/с, д. Прилукская Слобода, участок № 253	623688006601000485	0,1500 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	-	3 721 020	243 000 000	48 600 000
30	Шомыслицкий с/с, д. Прилукская Слобода, участок № 254	623688006601000486	0,1500 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	-	5 195 650	243 000 000	48 600 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **27.09.2013 г. в 10.00.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **23.09.2013 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1–4 перечисляется на расчетный счет № 3641900000150 Горанского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На Лоты 5–9 перечисляется на расчетный счет № 3641621030047 Ждановичского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052317, код платежа – 04901.

На Лоты 10–11 перечисляется на расчетный счет № 3641621200079 Заславского горисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600012999, код платежа – 04901.

На Лот 12 перечисляется на расчетный счет № 3641900000091 Крупицкого сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052399, код платежа – 04901.

На Лоты 13–19 перечисляется на расчетный счет № 3641900000277 Петришковского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052386, код платежа – 04901.

На Лоты 20–22 перечисляется на расчетный счет № 3641900000134 Сеницкого сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052409, код платежа – 04901.

На Лоты 23–24 перечисляется на расчетный счет № 3641900000121 Хатежинского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600231359, код платежа – 04901.

На Лоты 25–30 перечисляется на расчетный счет № 3641000000076 Щомыслицкого сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052373, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет с отметкой банка.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

** В разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.*

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Мозырская торговая компания «Полесье» (продавец)

извещает о проведении 11 сентября 2013 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-8

№ лота	Наименование	Адрес объектов	Начальная цена продажи объекта, с учетом НДС, бел. руб.	Начальная цена продажи имущества одним лотом, с учетом НДС, бел. руб.	Задаток, с учетом НДС, бел. руб
1	Здание одноэтажного кирпичного магазина № 56, инв. № 330/С-7946 площадью 61,2 кв.м	Гомельская обл., г. Мозырь, ул. 17 Сентября, 58А	23 587 680	24 115 920	2 411 592
	Многолетние насаждения в количестве двух деревьев (берез)		528 240		

Продавец: Открытое акционерное общество «Мозырская торговая компания «Полесье», 247760, г. Мозырь, ул. Ветровая, 21, тел. 8(0236) 37 67 39.

Шаг аукциона – 5% от начальной цены лота.

Для участия в аукционе необходимо:

1. **Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (Открытое акционерное общество «Мозырская торговая компания «Полесье») р/с № 3012203350014 в отделении ОАО «Белагропромбанк» г. Мозырь МФО 151501945, УНП 400082468, ОКПО 01568553.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: **ул. Гагарина, 20, каб. 2-8, г. Гомель в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 09 сентября 2013 г. в 17.00.**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 30.01.2013 г.

Порядок проведения конкурса и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на официальном сайте организатора торгов **www.gomeloblreklama.by.**

Дополнительная информация по телефонам организатора конкурса: **8 (0232) 74-59-73, 74-17-34.**

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельский радиозавод» (продавец)

извещает о проведении 30 сентября 2013 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-8

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи объектов, с учетом НДС, бел. руб.	Задаток, с учетом НДС, бел. руб
Местонахождение: Гомельская область, г. Гомель, ул. Объездная, 9			
1	Машина холодильная фреоновая мод. ХМ ФУУ 81 (инв. № 8470)	59 594 400	5 000 000
2	Машина холодильная фреоновая мод. ХМ ФУУ 81 (инв. № 8471)	59 594 400	5 000 000
3	Машина холодильная МТК-110-2-1 (инв. № 8352)	15 679 021	1 500 000

Продавец: Открытое акционерное общество «Гомельский радиозавод». Контактный тел.: (044)562-78-71.

Шаг аукционных торгов – 5%.

Для участия в аукционе необходимо:

1. **Оплатить задаток на расчетный счет продавца (ОАО «Гомельский радиозавод») р/с №3012111887011 в Региональной дирекции № 300 ОАО «БПС- Сбербанк», МФО 153001369, УНН 400069535.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: **ул. Гагарина, 20, каб. 2-8, г. Гомель в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 27 сентября 2013 г. в 17.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.**

Для участия в аукционе представляется пакет документов, с которыми вы можете ознакомиться на сайте **gomeloblreklama.by.**

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). В соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь может быть предоставлена рассрочка оплаты имущества.

Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 029 694 43 89; 8 (0232) 74-17-34, 74-59-73 и на сайте gomeloblreklama.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению Частного предприятия «МАВ-Недвижимость» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже

здания склада,

инвентарный номер 631/С-61208, об. пл. 886 кв.м, расположенного по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Чапаева, д. 26.

Начальная цена с НДС – 1 320 000 000 бел. руб.

Площадь земельного участка, предоставленного продавцу на праве аренды по 15.11.2037 г. для обслуживания здания склада, составляет 0,3991 га.

Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в отделении № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Аукцион состоится **27.09.2013 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703, пом. 5.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 26.09.2013 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: +375 17 280 36 37; 8029 183 69 71.

БОГУШЕВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

Березинского района Минской области (далее — Продавец) проводит открытый аукцион по продаже 1 (одного) земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Перевоз

№	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка	Наличие инженерных сетей	Начальная цена (бел. рублей)	Задаток (бел. рублей)
1	Березинский район, д. Перевоз, 620480808201000028	0,0882	Электроснабжение	10 000 000	2 000 000

** Примечание: земельный участок имеет ограничения в использовании земель в связи с нахождением в водоохранной зоне реки Березина.*

Задаток перечисляется на р/с № 3604060201878 в ЦБУ № 602 ф-ла № 612 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Борисова, код 810, УНП 600036587, ОКПО 04431855.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с документацией и земельным участком.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится 02 октября 2013 года в 10.00 по адресу: Березинский район, аг. Богушевичи, Богушевичский сельский Совет (зал заседаний).

Заявления на участие и необходимые документы принимаются ежедневно (кроме воскресенья) до 17.00 (в субботу до 13.00) по адресу: аг. Богушевичи Березинского района Минской области, Богушевичский сельский Совет.

Прием заявлений заканчивается не позднее чем за три рабочих дня до начала проведения аукциона.

Контактные телефоны: (8 01715) 48 3 12, (8 01715) 48 3 46.

РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «ТОРГМАШ»

Номер лота	ЛОТ № 1
Наименование объекта	Капитальное строение (инв. № 110/С-4873) площадью 514,0 м² – здание нежилое, наименование – здание
Местонахождение объекта	Брестская обл., г. Барановичи, ул. Чернышевского, д. 61
Продавец (Балансодержатель)	ОАО «Торгмаш»
Организатор торгов	РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление
Начальная цена продажи, руб. без НДС	911 671 000
Размер задатка, руб.	91 167 100
Право на земельный участок	Определение фактических границ земельного участка, необходимого для обслуживания продаваемых объектов, будет производиться после продажи, в соответствии с действующим законодательством
Условия продажи	Без условий
Тип и характеристика объекта	Общая площадь 514 м², площадь зстройки 540 м², объем здания 2683 м³. Год постройки 1992. Фундамент сборный железобетонный, стены кирпичные, перекрытия железобетонные, крыша рулонная, полы бетонные, плитка, деревянные, проемы оконные деревянные, проемы дверные металлические, деревянные, внутренняя отделка штукатурка и окраска. Инженерные коммуникации: отопление, электроснабжение, водопровод, канализация, горячее водоснабжение, вентиляция естественная
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона
Условия оплаты	Оплата производится в соответствии с заключенным договором купли-продажи
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012105618108 руб. РБ в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 153001369, УНП 102353509

Аукцион состоится 24 сентября 2013 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325.
Филиал «Центр «Белтехинвентаризация».
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.
Последний день приема заявлений – 23 сентября 2013 г. до 17.00.
Контактные тел.: 8 (0162) 23 92 59, 21 88 81.

Два многоквартирных жилых дома № 6 и № 7 в микрорайоне № 1 по проекту жилой застройки в границах улиц Шаранговича – Горецкого – Рафиева

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

УП «КАНИМИС»

информирует юридических и физических лиц о создании объекта долевого строительства.

ЗАСТРОЙЩИК – ЧТУП «КАНИМИС»

Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 3 апреля 2003 года № 505, в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100856965.

Юридический адрес: г. Минск, ул. Я. Коласа, д. 27, корп. 2, к. 28.

Почтовый адрес: г. Минск, ул. Гвардейская, д. 10, к. 1, телефон/факс +375173060802, +375173060781, режим работы: понедельник–пятница: с 9.00 до 18.00; выходные дни – суббота, воскресенье, обед с 13.00 до 14.00.

Ранее реализованные проекты: в настоящее время ведется строительство административного центра в квартале ул. К. Либкнехта и пер. Домашевский в г. Минске.

Цель строительства – исполнение инвестиционного проекта по договору № 239-Д на реализацию права проектирования и строительства объекта «Два многоквартирных жилых дома № 6 и № 7 в микрорайоне № 1 по проекту жилой застройки в границах улиц Шаранговича – Горецкого – Рафиева» от 18.05.2011 года с Минским городским исполнительным комитетом.

Объект строительства – два многоквартирных 16-этажных жилых дома № 6 и № 7 в микрорайоне № 1 по проекту жилой застройки в границах улиц Шаранговича – Горецкого – Рафиева.

Расположены в микрорайоне Сухарево в г. Минске.

Нормативная продолжительность строительства Объекта – 21 мес., ввод в эксплуатацию – III квартал 2013 года.

Застройщиком получены:

- решение Мингорисполкома от 12 июля 2012 года № 2218 «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства»;
- свидетельство (удостоверение) № 500/727-8015 о государственной регистрации создания земельного участка площадью 0,0065 га, расположенного по адресу: г. Минск, в границах ул. Шаранговича – Горецкого – Рафиева; свидетельство (удостоверение) № 500/727-8031 о государственной регистрации создания земельного участка площадью 0,6381 га, расположенного по адресу: г. Минск, в границах ул. Шаранговича – Горецкого – Рафиева;
- экспертное заключение РУП «ГЛАВГОССТРОЙЭКСПЕРТИЗЫ» от 22.12.2011 года № 1009-15/11;
- разрешение Инспекции Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску № 2-208Ж-139/11 от 01.03.2013 г.

Договор строительного подряда № 26/12 от 26.12.2012 г. с ООО «СМУ-25», № 07/08-2012 с ООО «СК-12».

Жилые дома расположены во Фрунзенском районе г. Минска.

Жилые дома № 6 и № 7 запроектированы с теплым чердаком, плоской кровлей, пассажирским и грузопассажирским лифтом, встроенными административно-торговыми помещениями. Вентиляция в квартирах – естественная. Конструктивная схема зданий – монолитный каркас с заполнением поризованным кирпичом. Наружная отделка решена на основе применения современных отделочных материалов и конструкций.

Сведения о благоустройстве: озеленение, устройство дорожных покрытий, благоустройство прилегающей территории.

В жилом доме № 6 запроектирован автоматизированный теплопункт.

Этажность – 16. Площадь жилого здания – 6064,55 кв.м. Общая площадь квартир – 4833,5 кв.м.

Всего в доме № 6 – 77 квартир, из них для привлечения к строительству по договорам создания объектов долевого строительства дольщиков – **граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий**:

двухкомнатных общей площадью от 60,96 до 67,33 кв.м – 1 квартира. Цена 1 кв.м – 12 909 982.

Трехкомнатных общей площадью от 84,11 до 84,87 кв.м – 1 квартира. Цена 1 кв.м – 12 411 749.

Всего в доме № 7 – 77 квартир, из них для привлечения к строительству по договорам создания объектов долевого строительства дольщиков – **граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий**:

Однокомнатных общей площадью 44,60 кв.м – 1 квартира. Цена 1 кв.м – 13 152 120.

Двухкомнатных общей площадью от 60,96 до 67,33 кв.м – 1 квартира. Цена 1 кв.м – 12 909 982.

Все квартиры имеют летние помещения (лоджии).

Общее имущество, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков:

межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, ненесущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию зданий.

Информацию по объекту долевого строительства и условиями заключения договоров можно получить в офисе УП «КАНИМИС» с 04.08.2013 года по адресу: г. Минск, ул. Гвардейская, 10 – 1А. Телефон/факс: 8(017)3060802, 8(017)3060781 с 9.00 до 18.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни: суббота, воскресенье.

Фотадымкі БЕЛТА.

ЗЛАВІЛІ ЎДАЧУ!

Рыбакі з Мінска ўзялі Кубак Беларусі па лоўлі паплавочнай вудай

МІНСКАЯ каманда Tubertini заваявала Кубак Беларусі на спаборніцтвах па спартыўнай лоўлі рыбы летняй паплавочнай вудай, якія прайшлі 24—25 жніўня на Пятровіцкім вадасховішчы ў Смалявіцкім раёне. Пра гэта карэспандэнту БЕЛТА паведаміў галоўны суддзя спаборніцтваў Аляксандр Загорскі.

Па выніках спаборніцтваў вага ўлову каманды-пераможцы склала 26,160 кг. Другое і трэцяе месца занялі адпаведна каманды «Выток» (Мінск) і Matchfiching (Мінск, Магілёў, Брэст).

Удзел у спаборніцтвах прынялі 11 камандаў па 4 чалавекі ў кожнай. Пры гэтым 5 камандаў былі пераможцамі чэмпіянату Беларусі па лоўлі рыбы паплавочнай вудай, астатніх 6 вылучылі абласныя структуры Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў.

Спаборніцтвы праходзілі ў два этапы, кожны з якіх завяршыўся ўзважваннем вылаўленай рыбы. Перамогу атрымлівала каманда, якая налавіла больш за ўсіх рыбы ў сваёй зоне. Пераможцы чэмпіянату Беларусі па лоўлі рыбы паплавочнай вудай і спаборніцтваў на Кубак Беларусі па спартыўнай лоўлі рыбы летняй паплавочнай вудай атрымліваюць магчымасць стаць удзельнікамі чэмпіянату свету па паплавочнай лоўлі рыбы.

Арганізатарам рэспубліканскіх рыбалоўных спаборніцтваў выступае Рэспубліканскае дзяржаўнае грамадскае аб'яднанне «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў». Адкрытыя спаборніцтвы на Кубак Беларусі па спартыўнай лоўлі рыбы летняй паплавочнай вудай праводзяцца з 2010 года.

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.10	20.09	13.59
Віцебск —	5.58	20.02	14.04
Магілёў —	6.01	20.00	13.59
Гомель —	6.01	19.53	13.52
Гродна —	6.26	20.24	13.58
Брэст —	6.30	20.21	13.51

Месяц

Апошняя квадра ў 12.35. Месяц у сузор'і Блізнят.

Імяніны

Пр. *ПРАЧЫСТАЯ (Успенне Багародзіцы).* ***К.*** *Патрыцыі, Аляксея, Аляксандры, Аўгусціна.*

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Сяброўкі:

— Марына, можна, я ў цябе застануся?

— Вядома, Света, позна ўжо.

— А ў цябе павукоў няма? Жудасна іх баюся!

— Не, змеі ўсіх з'елі.

Схадзіла з дзецьмі ў заапарк. Дзеці рыкалі, пішчалі, крычалі, махалі. Спадзяюся, звяры засталіся задаволенымі.

Жонка — мужу:

— Я тут у краме выдатны касцюм-тройку бачыла на цябе.

— Навошта мне касцюм?

— На працу хадзіць. У цябе ж ніводнага касцюма няма!

— Мне на працу можна хоць у адных трусах хадзіць! Мне касцюм наогул не патрэбен! Прыдумай хоць адзін аргумент, для чаго мне касцюм!

— Вова, а ў чым я цябе хаваць буду?..

Парада мужыкам: узрост дамы вызначыць зусім не так ужо і складана... Уяўляеш сабе, колькі, аднімаеш 10 гадоў — і ўсё роўна, адгадаў ты ці не: ўсе задаволеныя!

Жонка — мужу:

— Вой, якія мы ўразлівыя! Падумаеш, ненафарбаваную мяне ўбачыў! А мне цяпер з заікам ўсё жыццё жыві...

caricatura.ru

■ Запрашальнік

БУДУЧЫЯ МАМЫ ВЫЙДУЦЬ НА ПАРАД

У апошні дзень жніўня ў сталічным парку імя Горкага адбудзецца незвычайнае свята. Жанчыны, якія ў хуткім часе чакаюць прыбаўлення ў сям'і, збяруцца на «Пуз-парад».

Фота БЕЛТА.

Гэты некамерцыйны сацыяльны праект, закліканы засяродзіць увагу на дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне, абароне мацярынства і дзяцінства, існуе ўжо тры гады. Самы першы беларускі «Пуз-парад» адбыўся ў жніўні 2011-га ў Сілічах, дзе будучыя мамы пасадзілі цэлую алею клёнаў з пажаданнямі для чаканых немаўлят (між іншым, усе дрэўцы прыняліся і добра растуць). Летась у парку Горкага ўдзельніцы мерапрыемства ўсталявалі два дрэвы ў кадках — ружовае і блакітнае, на галінкі якіх таксама можна было прывязаць стужкі з пажаданнямі на шчасце.

У праграме сёлетняга парада — майстар-клас для бацькоў па слінганашэнні, прафесійная фотасесія і дэфіле-паказ будучымі мамамі выставы малюнкаў на жывоціках, традыцыйная акцыя для бацькоў «Ліст у будучыню», а для дзяцей — аквагрым і шэраг атракцыёнаў. Таксама ўсіх гасцей свята чакае канцэртная праграма з удзелам беларускіх артыстаў.

Дарэчы, для ўдзельніц абвешчаны адмысловы дрэс-код: уваход на свята выключна ў жоўтым адзенні. Менавіта яго арганізатары называюць афіцыйным колерам праекта — «бо жоўты выклікае адчуванне цеплыні, лёгкасці і весялосці, сімвалізуе добрае самаадчуванне, радасць і шчасце».

— Для ўдзелу ў «Пуз-парадзе-2013» зарэгістраваліся ўжо крыху больш як 40 чалавек, — расказала «Звяздзе» арганізатар свята, кіраўнік інтэрнэт-праекта prazdnik.by Алеся Какошнікава. — Але па вопыце мінулых гадоў мы ведаем, што ў апошні дзень, надзеўшы жоўтыя майкі, сукенкі і сарафаны, да свята далучаецца яшчэ больш будучых матуль, і мы стараемся нікога з іх не абмінуць увагай. З задавальненнем пасадзілі б яшчэ дрэвы, але парк імя Горкага і без таго шчыльна засаджаны, таму «Дрэвы жаданняў» на гэты раз паставім проста на галоўнай сцэне, і ўсе бацькі змогуць пакінуць лісты сваім будучым дачушкам і сыночкам.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

Даты Падзеі Людзі

1749 год — нарадзіўся філосаф і паэт Ёган Вольфганг Гётэ. У дзяцінстве ён вывучаў дакладныя навукі, жывапіс, гісторыю, музыку, фехтаванне. Ён цікавіўся хіміяй і з навуковай дакладнасцю апісваў свае доследы. У Лейпцыгу будучы паэт вывучаў права і пісаў вершы пра сваё першае каханне. Яго называлі містыкам, захопленым «дэманам паэзіі», геніем па-за часам, увасабленнем нямецкага духу, вялікім германскім патрыярхам, рэалістам-практыкам, першым паэтам. Ён пакінуў 143 тамы твораў і больш за 13 тысяч лістоў. А вяршыня яго паэзіі і філасофіі — вобраз доктара Фаўста.

1762 год — нарадзіўся Ян Рустэм, беларускі жывапісец, педагог. Творчасць яго была звязана з мастацкім жыццём Беларусі і Літвы. Вучыўся ў Варшаве і Германіі. У 1798-1832 гадах выкладаў у Віленскім універсітэце. Рэарганізаваў сістэму навучання ў Віленскай мастацкай школе. Падрыхтоўка ў гэтай школе давала магчымасць таленавітай моладзі Беларусі, Літвы і Польшчы паступаць у мастацкую акадэмію. У 1820-1822 гадах у школе вучыліся 45 жывапісцаў і 16 скульптараў, сярод якіх было шмат выхадцаў з Беларусі. Выхаванцамі школы былі В. Ваньковіч, Я. Дамель, Н. Орда, І. Хруцкі і іншыя. Сам Рустэм працаваў пераважна ў жанры партрэта. Ён аўтар шматлікіх аўтапартрэтаў, партрэтаў, акварэляў. Памёр у 1835 годзе.

1963 год— у ЗША адбыўся 200-тысячны «Марш на Вашынгтон у імя работы і свабоды» з патрабаваннямі расавай роўнасці пры працаўладкаванні і ліквідацыі беспрацоўя. Марцін Лютар Кінг з прыступак мемарыяла прэзідэнту Аўрааму Лінкальну выступіў з прамовай, якая ўвайшла ў гісторыю. Яна пачыналася словамі: «У мяне ёсць мара...».

Было сказана

Кузьма ЧОРНЫ, празаік, драматург, публіцыст:

«Спакой і вытрымка бяруць верх над крыкам і самаўпэўненасцю».

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 22.974. Індэкс 63850. Зак. № 3694.

Нумар падпісаны ў 19.30 27 жніўня 2013 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12